

Пацукі ці грошы?

СТАР 3



Як жывуць людзі без слыху

СТАР 4



Найбольш наркаманаў — у Мінску і Гомелі

СТАР 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 лістапада 2013 г. СЕРАДА № 223 (27588) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СПАКОЙНА, БЕЗ ХВАЛЯВАННЯЎ ПРАЙСЦІ ПРАЦЭДУРУ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

### Непрыватызаваныя да 1 ліпеня 2016 года кватэры пяройдуць у фонд арэнднага жылля

Пры фарміраванні ў Беларусі фонду арэнднага жылля неабходна максімальна ўлічваць інтарэсы грамадзян. Адпаведную задачу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў 26 лістапада на нарадзе аб фарміраванні фонду жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

На мерапрыемства былі запрошаны кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэй Кабякоў, віцэ-прэм'ер Анатоль Калінін, старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька і міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Шорац.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі жыллёвае будаўніцтва ўжо не адзін год знаходзіцца ў ліку галоўных прыярытэтаў. «Мы зусім нядаўна заявілі аб тым, што будзем выкарыстоўваць новую форму — узвядзенне і пашырэнне аб'ёмаў арэнднага жылля. Гэта запатрабавала і распрацоўкі адпаведнага нарматыўнага акта, каб увесці ў прававое поле новыя працэсы, — адзначыў Прэзідэнт. — Перш чым прыняць канчатковае рашэнне па гэтым вельмі важным пытанні, я хацеў бы пачуць аб тым, ці ўсё тут выверана і прадумана, каб нам не давялося праз месяц ці паўгода, як гэта ў нас часта бывае, уносіць якія-небудзь змяненні, дапаўненні, а яшчэ горш — адступаць ад тых рашэнняў, якія мы можам сёння прыняць».

Урад падрыхтаваў праект указа «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін». Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, прапановы ўносяць сур'ёзныя змяненні ў жыллёвую палітыку. Па сутнасці, прапануецца новы падыход да фарміравання фонду жылля камерцыйнага выкарыстання або так званага арэнднага жылля.

Аляксандр Лукашэнка пералічыў шэраг мер, якія прапануюцца праектам дакумента. Па-першае, што датычыцца стварэння фонду арэнднага жылля, да 1 красавіка 2014 года плануецца перавесці ў яго ўсе заселеныя службовыя і спецыяльныя жылыя памяшканні. А пасля 1 ліпеня 2016 года — уключыць у гэты фонд і непрыватызаваныя на гэту дату грамадзянамі дзяржаўныя кватэры, якіх налічваецца каля 330 тыс. «Не прыватызуюць, значыць, мы ўсё туды ўключым, зробім гэта дзяржаўнае жыллё арэндным, і плата за гэтыя кватэры будзе як за арэнднае жыллё», — сказаў Прэзідэнт.

Па-другое, устанаўліваецца пералік грамадзян, якія маюць права на прадастаўленне арэнднага жылля. Да таго ж прадугледжваецца, што атрыманне арэнднага жылля будзе лічыцца паляпшэннем жыллёвых умоў з далейшым зняццем з чаргі маючых патрэбу. «Гэта само сабой зразумела. Атрымаў кватэру, тым больш што мы дамовіліся аб тым, што кошт арэнднага жылля будзе ніжэйшы, чым сёння рыначны прыкладна напалову. Зразумела, што гэта будзе паляпшэнне. Якія яшчэ чарга і льготы?» — сказаў Прэзідэнт.

Па-трэцяе, вызначаецца памер платы за карыстанне арэндным жыллём. Пры гэтым аблвыканкамы і Мінгарвыканкам будуць мець права ўстанаўліваць паніжаючыя і павышаючыя каэфіцыенты.

Пераглядаюцца таксама падставы для пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жылля з мэтай вызначаць рэальныя патрэбнасці людзей і выключыць неабгрунтаваныя прэтэнзіі. «Гэта таксама правільна. Шарлатанства быць не павінна. Беларусь — адна з нямногіх дзяржаў, дзе прадастаўлены такія льготы, дзе дзяржава прадастаўляе магчымасць на льготных умовах будаваць жыллё. Таму тут павінна быць усё сумленна і справядліва», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што неабходна яшчэ раз прааналізаваць гэтыя прапановы, але, галоўнае, улічваць інтарэсы грамадзян. Ён звярнуў асаблівую ўвагу кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта на неабходнасць навядзення парадку ва ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. «Тут сёння мора недахопаў, і аб гэтым мы ўжо не раз гаварылі», — заўважыў Прэзідэнт.

Паводле слоў Андрэя Шорца, інтарэсы грамадзян у працэсе фарміравання фонду арэнднага жылля ні ў якім выпадку не будуць ушчэмлены. «Праект указа распрацаваны менавіта з улікам гэтых падыходаў. Прадугледжаны цэлы комплекс мер па абароне тых грамадзян, якія не змогуць або не захочуць па тых ці іншых прычынах прыватызаваць кватэру. Калі сям'я або канкрэтны грамадзянін мае права на атрыманне сацыяльнага жылля, то, калі паступіць хадайніцтва, гэта кватэра можа быць пераведзена ў разрад сацыяльнай, і ён не будзе выплачваць арэндную плату», — сказаў міністр.

Андрэй Шорац паведаміў, што грамадзяне могуць падаць заяву аб прыватызацыі да 31 чэрвеня 2016 года — на працягу месяца прымаецца рашэнне — а потым аформіць ва ўласнасць жылое памяшканне можна будзе яшчэ фактычна на працягу наступнага года.

«Думаю, што практычна за два з паловай гады, якія ў нас яшчэ наперадзе, мы зможам спакойна і без усялякіх хваляванняў прайсці працэдуру прыватызацыі. Адпаведныя службы да гэтага гатовы», — запэўніў міністр. Паводле яго слоў, у праекце ўказа прадугледжана, што дагавор на карыстанне арэндным жыллём будзе заключацца на 5 гадоў з правам яго далейшага прадаўжэння.

У цэлым кіраўнік дзяржавы адобрыў падрыхтаваны ўрадам праект указа і даў канкрэтныя даручэнні аб падрыхтоўцы комплексу мер па яго рэалізацыі з невялікімі дапрацоўкамі. Так, у праекце першапачаткова прадугледжвалася ажыццяўляць пастаноўку маладых сем'яў на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на агульных падставах зыходзячы з крытэрыяў патрэбнасці. Аднак Прэзідэнт не згадзіўся з такім падыходам, і пастаноўка маладых сем'яў на адпаведны ўлік будзе ажыццяўляцца на ранейшых прынцыпах.

## ПЕРШАЯ ЛЫЖНЯ НА ПЕРШЫМ СНЕЗЕ



г. Мінск.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Супраць наркотыкаў

## ГЕАПАЛІТЫКА... ЗАЛЕЖНАСЦІ

### Віктар Іваноў — пра заказчыкаў легалізацыі наркотыкаў, аперацыі праваахоўных органаў і іншыя падзеі на антынаркатычным фронце

**Заўтра ў Беларусі адбудзецца пасяджэнне Каардынацыйнага савета кіраўнікоў кампетэнтных органаў па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў дзяржаў — членаў АДКБ (КСОСН АДКБ). Сярод іншага будзе абмеркавана і, магчыма, зацверджана антынаркатычная стратэгія АДКБ да 2020 года. Аб наркатычнай сітуацыі ў нашым рэгіёне ў спецыяльным інтэрв'ю газеце «Звязда» распавёў старшыня КСОСН АДКБ, старшыня Дзяржаўнага антынаркатычнага камітэта (ДАК) Расіі, дырэктар Федэральнай службы Расійскай Федэрацыі па кантролі за абаротам наркотыкаў Віктар ІВАНОЎ.**



**— Віктар Пятровіч, 2013 год для многіх запомніцца, бадай, першымі, на міжнародным узроўні, адкрытымі выступамі аб легалізацыі наркотыкаў альбо, як мінімум, змене парадыгмы барацьбы з наркотыкамі. Як вы ацэньваеце сучасную наркатычную сітуацыю ў свеце? Ці прыйшоў час новых падыходаў у барацьбе з наркамафіяй?**

— У 2013 годзе Глабальная камісія ААН прадставіла даклад аб неабходнасці згортвання барацьбы з распаўсюджваннем наркотыкаў, паколькі наркабізнес, маўляў, перамог планетарную супольнасць. Было прапанавана легалізаваць спажыванне канабісу (марыхуаны, каноплі і вытворных з яе пылка — гашыша і анашы). Логіка дакладчыкаў: у свеце павялічылася спажыванне какаіну, значыць, трэба легалізаваць марыхуану.

СТАР. 2

## ЗА ШТО МЫ ПЛАЦІМ: «РАСШЫФРОЎВАЕМ» НОВУЮ ЖЫРОЎКУ

**Мінчане гэтай восенню пачалі атрымліваць жыроўкі з дэталізацыяй фактычных затрат па графе «Тэхнічнае абслугоўванне». Камунальнікі абяцаюць, што ўжо ў 2014 годзе такія падрабязныя жыроўкі будуць атрымліваць усе жыхары Беларусі. Але ў многіх жыльцоў новае паведамленне для аплаты камунальных паслуг выклікала шэраг пытанняў. Не ўсе ўяўляюць сабе, што менавіта маецца на ўвазе пад «кіраўніцкімі выдаткамі», «паслугамі іншых арганізацый» і г.д. «Звязда» папрасіла «расшыфраваць» некаторыя віды работ і паслуг па тэхабслугоўванні начальніка разлікова-даведачнага цэнтра № 3 ЖРЭА Цэнтральнага раёна Мінска Наталлю ЧАРНУХУ.**

Такім чынам, глядзім на **дадатковую інфармацыю** ў рахунку.

**Прыбіранне прыдамавой тэрыторыі, унутрыдамавых дапаможных памяшканняў, абслугоўванне смеццеправода**

— першы, другі і дзясяты радкі выдаткаў — **«Прыбіранне прыдамавой тэрыторыі», «Прыбіранне ўнутрыдамавых дапаможных памяшканняў», «Абслугоўванне смеццеправода, утрыманне кантэйнерных пляцовак»** уключаюць у сябе наступныя выдаткі:

— на аплату працы рабочых па комплексным прыбіранні (дворнікаў),

— на матэрыялы,

— агульнавытворчыя выдаткі (зарплата майстроў, выдаткі на ўтрыманне майстэрняў участкаў).

Пры гэтым разлік затрат па кожным канкрэтным жылым доме робіцца, зыходзячы з аб'ёмаў выкананых работ, адлюстраваных у нарад-заданнях на рабочых па комплексным прыбіранні прапарцыянальна плошчам, замацаваным за брыгадай.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай САМАСЕЙКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах**

***«Думаю, што першапачаткова няправільным быў падзел судоў на агульныя і гаспадарчыя. І чым далей, тым больш… Усё ішло да таго, што адны і тыя ж праваадносіны агульныя і гаспадарчыя суды трактавалі не сказаць, што дыяметральна процілегла, але падыходы адрозніваліся, а значыць, адрозніваліся і рашэнні. Таму аб'яднанне гэтых судоў у адну сістэму, заяўленае Прэзідэнтам Беларусі, можна лічыць прагрэсіўным крокам».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.11.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9320,00 | ▲ |
| Еўра | 12620,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 282,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1135,96 | ▲ |

### ЛАНДЫШЫ І КРОКУСЫ

Нацыянальны банк ўвёў у абарачэнне сярэбраныя памятныя манеты «Ландыш (Convallaria)» і «Крокус (Crocus)» серыі «Прыгажосць кветак», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.

Абедзве маюць намінал 10 рублёў, пробу сплаву 925, масу 14,14 грама, дыяметр 32 міліметры. Адчаканены на Манетным двары Польшчы якасцю «пруф», тыражом да 8000 штук кожнага наймення.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### ПЕРАНОС РАБОЧЫХ ДЗЁН У 2014 ГОДЗЕ

**Такое рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў ад 25 лістапада гэтага года № 1012. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Рабочыя дні ў 2014 годзе пераносяцца наступным чынам: з чацвярга 2 студзеня на суботу 4 студзеня; з панядзелка 6 студзеня на суботу 11 студзеня; з серады 30 красавіка на суботу 3 мая; з пятніцы 4 ліпеня на суботу 12 ліпеня; з пятніцы 26 снежня на суботу 20 снежня.

Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) ажыццяўляць перанос рабочых дзён у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЖУРНАЛІСТАМ ЗАБАРАНЯЮЦЬ ЗДЫМАЦЬ АБАМУ



Прэзідэнта ЗША Барака Абаму стала цяжэй злавіць у аб'ектыў: Белы дом забараняе журналістам ажыццяўляць фота- і відэаздымку важных сустрэч лідара краіны. Тлумачыцца такая забарона «прыватным» характарам усіх мерапрыемстваў. У сувязі з гэтым больш за тры дзясяткі найбуйнейшых СМІ падпісаліся пад адкрытым зваротам да прэс-сакратара Белага дома Джэя Карні. Яны запатрабавалі даць рэпарцёрам больш свабоды пры фатаграфаванні Абамы за выкананнем службовых абавязкаў і падчас працоўных сустрэч.

Прадстаўнікі прэсы скардзяцца, у прыватнасці, што Белы дом не пускае іх нібыта з-за «прыватнага» характару мерапрыемстваў. Аднак пасля здымкі і відэа з такіх сустрэч, зробленыя афіцыйнымі фатографамі адміністрацыі, рэгулярна выкладваюцца ў інтэрнэт. На думку рэпарцёраў, адміністрацыя супярэчыць сама сабе.

### ПАПА ФРАНЦЫСК АСУДЗІЎ «КУЛЬТ ГРОШАЙ»



Папа Рымскі Францыск 26 лістапада выступіў за карэннае абнаўленне Каталіцкай царквы, яе дэбюракратызацыю і наданне большай увагі праблемам самых бедных жыхароў планеты. Пантыфік выказаўся супраць «дзікага капіталізму», названага ім «новай тыраніяй», і заклікаў сусветных лідараў больш актыўна змагацца з галечай і няроўнасцю ў сваіх краінах, забяспечыць сваіх грамадзян працай, адукацыяй і медыцынскім абслугоўваннем.

У 84-старонкавым Апостальскім звароце Францыск падкрэсліў, што сусветная эканамічная сістэма стала заганнай, паколькі яна цалкам пабудавана на «кульце грошай». Папа Рымскі заклікаў багатых людзей больш ахвяраваць бедным. На думку пантыфіка, у свеце склалася няправільная сістэма прыярытэтаў. Яго абурэнне выклікаў той факт, што смерць бяздомнага не трапляе ў навіны, а змена банкаўскага індэкса на два працэнты становіцца сенсацыяй.

### ШАТЛАНДЫЯ МОЖА ВЫЙСЦІ СА СКЛАДУ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Шатландыя можа выйсці са складу Вялікабрытаніі і стаць незалежнай дзяржавай 24 сакавіка 2016 года, перадаюць інфармагенцтвы. Рашэнне аб выхадзе Шатландыі са складу Вялікабрытаніі можа быць прынята на рэферэндуме, запланаваным на 18 верасня 2014 года. У маі 2016 года, згодна з планам, павінны прайсці выбары ў парламент незалежнай Шатландыі. Як паведамляецца, урад Шатландыі ў бліжэйшыя дні рыхтуецца прадставіць грамадскасці «Белую кнігу» — афіцыйны заканадаўчы дакумент, прысвечаны прынцыпам будучай незалежнасці Шатландыі. У прыватнасці, у дакуменце будуць растлумачаны перспектывы ператварэння Шатландыі ў асобную дзяржаву. Паводле апытанняў грамадскай думкі, большасць шатландцаў падтрымлівае ідэю аўтаноміі, але не гатова да поўнага разрыву са Злучаным Каралеўствам.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### МАРОЗІВА — НОВЫ АНТЫДЭПРЭСАНТ?

Супрацоўнікі даследчага інстытута Лондана сцвярджаюць, што з дапамогай марозіва можна змагацца з дэпрэсіяй і ўздымаць чалавеку настрой. Падчас эксперыменту добраахвотнікам было прапанавана з'есці па порцыі марозіва. Пасля чаго навукоўцы з дапамогай магнітна-рэзананснай тамаграфіі даследавалі рэакцыі ў галаўным мозгу.



Высветлілася, што марозіва змагло істотна паўплываць на актывацыю зон мозга, якія адказваюць за з'яўленне адчування радасці. Прычым даследчыкі ўстанавілі, што хапае адной толькі лыжкі марозіва, каб гэта адбілася на працы мозга і ў чалавека ўзняўся настрой. Раней навукоўцы Кайл Бергер і Эрык Стайс устанавілі, што прадукты накшталт марозіва ўплываюць на мозг, нібы наркотыкі.

КОРАТКА

Навагоднюю ілюмінацыю на ёлках у Мінску плануецца ўключыць 16 снежня.

На 1 кастрычніка запасы гатовай прадукцыі ў арганізацыях прамысловасці Беларусі складалі 70,6 працэнта сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці.

Музей нітак з'явіўся ў Гродне. Экспазіцыя адкрылася ў ААТ «Гранітэкс». Прадстаўлены калекцыі як саміх нітак, так і калаўротаў, верацён, а таксама кросны, швейныя машыны, ткацкія станкі, фрагменты прадзільных машын, фатаграфіі і іншае.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі 27 лістапада правядзе тэхнічную праверку сістэмы апавяшчэння. Пройдзе праверка функцыянавання абсталявання перахвату радыёвяшчальных станцый, апавяшчэнне насельніцтва з выкарыстаннем SMS-рассылкі мабільных апаратараў, а таксама бягучага радка на тэлеканалах.

З 1 снежня адкрыецца рух транспарту па вул. Алібегава ў Мінску на ўчастку ад вул. Сямашкі да пр. Газеты «Праўда». Адначасова з гэтым стане даступнай і новая развязка на пр. Дзяржынскага, будаўніцтва якой вялося з сярэдзіны 2011 года.

Новы пяцізоркавы атэль з захаваннем гістарычнага аблічча будынка пабудуе турэцкая кампанія ў цэнтры Мінска ў будынку былога ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа», размешчанага на вул. Чырвонай, 23.



■ Факт і каментарый

# МАЛА ТОЛЬКІ НАРАДЗІЦЬ

**Згодна з інфармацыяй Навукова-даследчага эканамічнага інстытута, колькасць насельніцтва Беларусі да 2030 года зменшыцца на 211 тысяч чалавек. Пры гэтым гараджан стане больш на 2,6%, а сельскае насельніцтва скароціцца амаль на 400 тысяч чалавек. У нашай краіне для стымуляцыі нараджальнасці робіцца нямала. Быў прыняты закон аб дэмаграфічнай бяспецы і на яго аснове працуе адпаведная нацыянальная праграма. Дзяржава аказвае дапамогу сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у тым ліку дапамагае ў будаўніцтве жылля. Ці дастаткова гэтых мер, каб выратаваць рэгіёны ад дэпапуляцыі і выйсці з дэмаграфічнай ямы, мы спыталі ў намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыкі Святланы ШЫЛАВАЙ:**

— Адмоўны рост насельніцтва пачаўся ў Беларусі з 1993 года, і гэтая тэндэнцыя, на жаль, пакуль працягваецца. З 1993 па 2011 год колькасць жыхароў нашай краіны скарацілася амаль на 770 тысяч чалавек (каля 7,5%).

Асноўныя прычыны дэпапуляцыі: нізкая нараджальнасць, агульная смяротнасць і міграцыя. Нацыянальная праграма з 2011 па 2015 год прадугледжвае стабілізацыю колькасці насельніцтва за кошт павышэння нараджальнасці. Але вырашыць пытанне дэмаграфіі толькі з дапамогай гэтага фактару мы не зможам. Тое, што было прынята дзяржавай па праграмах да 2012 года (павышэнне дапамогі на дзяцей да 3-гадовага ўзросту і г.д.), адыграла станоўчую ролю з пункту гледжання дэмографаў. У нас была вялікая колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту, таму і павялічылася нараджальнасць. Але ж гэта адбывалася і таму, што тыя жанчыны, якія адкладалі нараджэнне другога дзіцяці, нарадзілі яго раней.

Другая праблема — высокая смяротнасць. Асабліва ў сельскай мясцовасці, паколькі ўзровень смяротнасці вызначаецца ўзроставай структурай насельніцтва. У нашай краіне расце колькасць людзей пажылога ўзросту. А ў сельскай мясцовасці жывуць і застаюцца менавіта старыя. Акрамя павышэння нараджальнасці, мы павінны працаваць на зніжэнне смяротнасці. І ў першую чаргу трэба зніжаць яе ў працаздольным узросце, бо



такіх у структуры смяротнасці — 24%. Асноўныя прычыны зыходу з жыцця ў гэтым узросце: хваробы сістэмы кровазвароту (52%), злаякасныя новаўтварэнні (13,4%) і знешнія прычыны (10%).

Асаблівы ўплыў на рост смяротнасці аказвае негатыўная змена здаровага ладу жыцця. Наша насельніцтва не займаецца сваім здароўем. Ёсць такі выраз: «нездавальняючыя самазахавальныя паводзіны насельніцтва». Знешнія прычыны — гэта п'янства, аўтамабільныя катастрофы і г.д. Толькі на 10% стан здароўя насельніцтва залежыць ад сістэмы аховы здароўя, на 20% — ад экалогіі, на 20% — ад спадчыннасці і на 50% — ад ладу жыцця.

Здаровы лад жыцця павінны прапагандаваць не толькі палітыкі, СМІ, але самае галоўнае — сям'я. Здаровы лад жыцця абавязкова паўплывае на дэмаграфію. Трэба паказваць сваім дзецям прыклад. На жаль, сучасныя дзеці бавяць свой вольны час не на горках, з санкамі, на лыжах, на каньках, у двары. Нашы дзеці аддаюць перавагу камп'ютарам...

На заканадаўчым узроўні дзяржава прымае захады па павелічэнні насельніцтва, але ў самога насельніцтва не заўсёды ёсць такое імкненне. Нараджальнасць ніколі не будзе адзіным уплывовым фактарам дэмаграфічнага становішча краіны. Трэба разам змагацца са смяротнасцю ў працаздольным узросце і прапагандаваць здаровы лад жыцця. І пачаць трэба непасрэдна са сваёй сям'і.

**Крысціна ПЯСЕЦКАЯ**

■

■ Як нас дураць

# РАСПЛАЦІЎСЯ ГРАШЫМА, ЯКІЯ ЎЖО НЕ ІСНУЮЦЬ

**У сталіцы за махлярства з грашыма, якія ўжо выйшлі з абарачэння, затрымалі 60-гадовага рэцыдывіста, які падманам завалодаў дзвюма курткамі і 300 тысячамі рублёў, што належалі пенсіянерцы.**

Гісторыя пачалася на кірмашы, дзе жанчына прадавала тыя самыя курткі. Імі зацікавіўся пажылы мужчына, які ўзяў у пенсіянеркі тэлефон і паабяцаў перазваніць ёй увечары наконт пакупкі. Сапраўды, перазваніў, абмеркаваў здзелку, прызначыў сустрэчу, падчас якой, забраўшы курткі, прапанаваў прадаўшчыцы расплаціцца з ёй расійскімі рублямі. Працягнуў купюру ў 5 тысяч. Жанчына пагадзілася і адлічыла пакупніку рэшту ў суме 300 тысяч беларускіх рублёў. І толькі пасля зразумела, што атрыманая расійская купюра — 1992 года выпуску. Яна ўжо выйшла з абарачэння і не з'яўляецца плацежным сродкам.

Паводле інфармацыі Савецкага РУУС г. Мінска, затрыманы зламыснік раней быў судзімы за махлярства ажно шэсць разоў. Апошні раз ён вызваліўся з «месцаў, не вельмі аддаленых», у маі. Дарэчы, праваахоўнікам стала вядома, што за такія ж «пустыя абгорткі» падазроны спрабаваў набыць яшчэ і касметычную прадукцыю, і прадукты харчавання, але па розных прычынах не здолеў давесці свае планы да канца. Таму ёсць падставы меркаваць, што яшчэ не пра ўсе «подзвігі» рэцыдывіста вядома.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# ЗА ШТО МЫ ПЛАЦІМ: «РАСШЫФРОЎВАЕМ» НОВУЮ ЖЫРОЎКУ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Наталля Чарнуха тлумачыць, якія віды работ уключаюць у сябе гэтыя радкі выдаткаў.

**Прыбіранне прыдамавой тэрыторыі**

Усе віды прыбірання на прыдамавых тэрыторыях; касьба травы; паліў двароў, праездаў; вываз буйнагабарытных адходаў звыш аплаты насельніцтвам (г.зн. звыш 0,11 куб. м. на чалавека ў год); сартаванне другасных матэрыяльных рэсурсаў і буйнагабарытных адходаў; ачыстка урнаў, дошак аб'яў, мемарыяльных дошак.

**Прыбіранне ўнутрыдамавых дапаможных памяшканняў**

Усе віды прыбірання ўнутры дамоў (акрамя санітарнага абслугоўвання смеццепрыёмных камер і смеццеправодаў), прыбіранне ліфтаў.

**Абслугоўванне смеццеправода, утрыманне кантэйнерных пляцовак**

Усе віды работ па санітарным, тэхнічным утрыманні смеццеправодаў, смеццепрыёмных камер; выдаленне цвёрдых камунальных адходаў са смеццекамер; прыбіранне кантэйнерных пляцовак.

**Кіраўніцкія выдаткі**

Трэці радок выдаткаў — «Кіраўніцкія выдаткі» уключае ў сябе выдаткі на аплату працы работнікаў апарату кіравання ЖЭСаў і ЖРЭА, а таксама на інтэрнэт-паслугі, праграмнае забеспячэнне, пазаведамасную ахову, пажарную сігналізацыю, паслугі сувязі, канцылярскія прыналежнасці, утрыманне службовага аўтатранспарту і інш.

**Асвятленне дапаможных памяшканняў (пад'езд, падвал)**

Чацвёрты радок — «Асвятленне дапаможных памяшканняў (пад'езд, падвал)» уключае ў сябе выдаткі на асвятленне шляхам прамога размеркавання выдаткаў.

Наша суразмоўца патлумачыла, што пад дапаможнымі памяшканнямі маюцца на ўвазе памяшканні, размешчаныя ўнутры блочнага дома па-за кватэрамі (вестыбюль, калідор, галерэя, лесвічныя пляцоўкі, ліфтавыя холы і інш.).

**Тэхнічнае абслугоўванне канструктыўных элементаў жылога дома**

У радок выдаткаў — «Тэхнічнае абслугоўванне канструктыўных элементаў жылога дома» ўключаюцца наступныя выдаткі:

— аплата працы рабочых, якія выконваюць тэхнічнае абслугоўванне канструктыўных элементаў жылых дамоў уласнымі сіламі,

— выдаткі на набыццё матэрыялаў,

— агульнавытворчыя выдаткі (зарплата майстроў).

У гэты пункт уключаюцца работы, указаныя ў нарад-заданнях на выкананне работ па прафілактычным аглядзе і рамонце канструктыўных элементаў жылога дома згодна з графікам і ў адпаведнасці з пералікам работ па тэхнічным абслугоўванні і перыядычнасці іх выканання.

Сюды таксама можа ўваходзіць тэхабслугоўванне канструктыўных элементаў жылых дамоў, выкананае з прыцягненнем падрадных арганізацый. Пры гэтым падраднай арганізацыяй павінны быць прадстаўлены ў бухгалтэрыю акты выкананых работ у разрэзе кожнага дома.

Наталля Чарнуха патлумачыла, што пад канструктыўнымі элементамі будынка маюцца на ўвазе падмуркі вонкавых сцен, міжпавярховыя перакрыцці, дах, вокны, дзверы, печы, балконы і балконныя агароджы.

**Тэхнічнае абслугоўванне ўнутрыдамавых інжынерных сістэм**

Гэты радок выдаткаў складаецца з тых жа выдаткаў, што і папярэдні. Сюды ўключаюцца работы па прафілактычным рамонце і аглядзе інжынернага абсталявання згодна з графікам і ў адпаведнасці з пералікам работ па тэхнічным абслугоўванні і перыядычнасці іх выканання. Таксама ў гэтую графу ўключаюцца работы па ліквідацыі аварый на ўнутрыдамавых інжынерных сістэмах гарадской аварыйнай службай.

Інжынерныя сістэмы, па словах Наталлі Чарнухі, — гэта сістэмы ацяплення, гарачага і халоднага водазабеспячэння, водаадвядзення (каналізацыя), газа-, электразабеспячэнне, вентыляцыі, смеццеправоды, ліфты і іншыя сістэмы жылога дома, якія забяспечваюць неабходныя санітарныя і тэхнічныя патрабаванні.

**Супрацьдымная абарона**

У гэты пункт уключаюцца работы па штотыднёвым тэхаглядзе сістэм, штомесячным тэхабслугоўванні, штоквартальным тэхабслугоўванні прытокава-выцяжной вентыляцыі, штогадовыя аэрадынамічныя выпрабаванні, штогадовыя электрафізічныя вымярэнні электраабсталявання, дыспетчарскі кантроль за спрацоўваннем сістэм.

Тэхабслугоўванне сістэм супрацьдымнай абароны і кіруючых імі сістэм аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі ажыццяўляе спецыялізаваная арганізацыя па дамове-падрадзе з ЖРЭА. Пры гэтым акты выкананых работ павінны перадавацца ў бухгалтэрыю падраднай арганізацыяй па кожным доме.

**Паслугі іншых арганізацый (па дагаворах)**

Гэта паслугі па адлове бадзяжных жывёл, выдаткі на транспарт, што прыцягваецца для прыбірання, вывазу буйнагабарытнага смецця і апалай лістоты. Акрамя таго, у гэтай графе адлюстроўваюцца выдаткі на прыцягненне падрадных арганізацый для прачысткі дымавых і вентыляцыйных каналаў, рамонт помпаў і цеплаабменнікаў у цеплавых пунктах, наладка і праверка групавых прыбораў уліку вады і цяпла, хімічнае прамыванне бойлераў і сістэм ацяплення (пры неабходнасці). Тут таксама ўлічваюцца паслугі праектных і спецыялізаваных арганізацый, якія ажыццяўляюць розныя абследаванні дома.

**Камісійныя выдаткі за пералік жыллёва-камунальных плацяжоў**

Гэты радок уключае выдаткі па аплаце банкам і пошце.

**Падаткі і абавязковыя плацяжы**

Яны ўключаюць у сябе падатак на нерухомасць, зямельны падатак, падатак на дабаўлены кошт (па матэрыялах, асноўных сродках, работах, паслугах), экалагічны падатак, адлічэнні ў Белдзяржстрах.

**Дэратызацыя (дэзынсекцыя)**

Гэты радок уключае разлік выдаткаў на дэратызацыю і дэзынсекцыю (комплекс мер па знішчэнні грызуноў), які ажыццяўляецца на падставе актаў выкананых работ за месяц.

**Амартызацыйныя налічэнні**

У гэты артыкул уключаюцца амартызацыя асноўных сродкаў (камп'ютарная тэхніка, мэбля, дарагі інструмент і інш.) і амартызацыя па нежылых памяшканнях.

**«Іншыя»**

Сюды ўключаны выдаткі на ўтрыманне ўласнага транспарту ЖЭСаў і ЖРЭА (рамонт, запчасткі, тэхабслугоўванне, зарплата вадзіцеляў), а таксама выдаткі на ўтрыманне разлікова-даведачных цэнтраў.

**Святлана БУСЬКО.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

# СТВАРЭННЕ ЦУДУ

**Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» рыхтуецца да свайго 40-годдзя, якое будзе адзначацца ў наступным сезоне. А пакуль артысты распачалі гастрольны і ў нейкім сэнсе справаздачны тур канцэртаў, прысвечаных юбілею.**

**Днямі такі канцэрт адбыўся ў сталічным Палацы Рэспублікі. Як і заўсёды, канцэрт прайшоў пры перапоўненай зале, з выключным поспехам. У фінале захопленыя, расчуленыя гледачы, стоячы, хвілін дзесяць дзякавалі артыстам бурнымі, шчырымі апладысментамі.**

**Наш карэспандэнт сустрэўся з мастацкім кіраўніком «Харошак», народнай артысткай рэспублікі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі Валянцінай Гаявой і папрасіў яе расказаць, як знакаміты калектыў пачынаў свой творчы шлях, як ён ішоў да свайго фенаменальнага поспеху.**

— Працуючы над першай праграмай для маладога калектыву, я аказалася перад няпростым выбарам: якім шляхам ісці? Адзін з іх патрабаваў беражлівага захоўвання аўтэнтычнага танцавальнага мастацтва, перадаваць яго ў нерушавым, натуральным стане. Другі, найбольш папулярны ў савецкія часы, сведчыў аб тым, што поспех можа забяспечыць толькі народна-сцэнічная апрацоўка фальклору.

Мяне ж ні першы, ні другі шлях не задавальняў. Простае, механічнае перанясенне народных танцаў на сцэну прыводзіла, як правіла, да спрошчанасці, прымітывізму. Залішняя апрацоўка фальклору, увядзенне ў яго элементаў поп-культуры і розных аўтарскіх вынаходак «забівала» народную душу. Мне ж хацелася якраз гэтую душу раскрыць, паказаць усё яе багацце і хараство.

**— Раскажыце, калі ласка, як ствараліся першыя нумары. Яны нараджаліся на фальклорнай аснове ці тут галоўную ролю адыграла ваша ўласная фантазія? А можа, нешта пераймалі і творча перапрацоўвалі падгледжанае ў вядомых, знакамітых калектываў?**

— У вядомых калектываў я, безумоўна, вучылася, але ніколі нічога не пераймала. Вучылася ў іх сцэнічнаму майстэрству, уменню будаваць нумар, складаць праграму, каб яна была цэльная, арганічная і ў той жа час разнастайная, яркая, відовішчная.

Свае нумары я стварала па-рознаму. У адным выпадку пераважала фальклорная аснова, мы толькі надавалі ёй сучасную, больш прывабную форму. У другім — я ішла ад асабістых уражанняў, ад падгледжанага ў жыцці. Часам дзейнічала наперакор закасцянелым традыцыям. Чамусьці лічылася, што беларусам уласцівы ўсяго тры рухі: так званы просты ход, пераменны ход і полька. Некаторыя, дарэчы, і цяпер абыходзяцца толькі гэтым. А ў танцы самае важнае — прыдумаць адметны рух і надалей развіваць яго, ствараючы арыгінальныя, відовішчныя карункі. Але, разам з тым, у гэты рух павінна быць закладзена думка, вобраз, эмоцыя. З самага пачатку я імкнулася да таго, каб кожны танец быў самастойным, каб артысты не проста бегалі па сцэне ды весяліліся, а неслі нейкую ідэю, прымушалі гледача над чымсьці задумацца.



**— Валянціна Іванаўна, як пры такім грунтоўным, выключна патрабавальным і цалкам арыгінальным падыходзе вы змаглі падрыхтаваць калектыў за кароткі тэрмін? Наколькі я ведаю, менш чым праз год «Харошкі» ўжо заявілі пра сябе першым публічным выступленнем.**

— Так, «Харошкі» нарадзіліся роўна праз дзевяць месяцаў *(смяецца)*. І нарадзіліся пад шчаслівай зоркай. Першыя ж выступленні прынеслі вялікі поспех. Праз год ужо мы паехалі на гастролі ў Малдавію. А пасля серыі нашых канцэртаў ва Украіне кіраўнік ансамбля імя Вірскага Яраслаў Вантух усклікнуў: «Гэта была бомба!». Яны не чакалі, што пасля праслаўленых савецкіх калектываў можна яшчэ нешта прыдумаць, зрабіць новае, нечаканае, цікавае. А мы здзівілі і ўразілі публіку сваёй непадобнасцю, сваім адметным почыркам.

Але галоўны поспех нас чакаў у Маскве. У 1977 годзе на Усесаюзным конкурсе прафесіянальных калектываў, прысвечаным 60-годдзю Кастрычніка, «Харошкі» сталі лаўрэатамі і атрымалі дыплом першай ступені. Гэта была ў нейкім сэнсе сенсацыя. Таму што дагэтуль беларусы, у адрозненне ад украінцаў і грузін, нічым асаблівым не вызначаліся на маскоўскіх сцэнах. А тут — перамога! Мы тады былі нарасхват. Далі па два канцэрты ў зале «Расія» і ў зале Чайкоўскага. І ўсюды — аншлаг.

**— З таго часу мінула ўжо амаль сорак гадоў. Але і цяпер «Харошкі» збіраюць поўныя залы. Публіка з захапленнем прымае кожны нумар, а пасля выступлення наладжвае артыстам бурныя авацыі. Гэтаму я быў сведкам і сам, пабываўшы на нядаўнім вашым канцэрце. Дык у чым жа сакрэт вашага пастаяннага поспеху? Як вам удаецца на працягу гэтулькіх гадоў здзіўляць і захапляць гледача? Прычым не толькі дома, але і далёка за межамі, у самых розных краінах?**

— Сваю папулярнасць мы заваявалі тым, што з самага пачатку былі не падобныя на іншых. Можа, і нясціпла так казаць, але да нас многія калектывы альбо будавалі свае танцы на адным руху, альбо пераймалі, практычна капіравалі тое, што выконвалі іншыя. Мы ж паставілі сабе задачу-максімум: кожны нумар рабіць арыгінальным, непаўторным. На аснове народна-сцэнічнага танца ствараем міні-балеты, у якіх ёсць змест. Абавязкова. Ёсць сюжэт — экспазіцыя, развіццё тэмы і кульмінацыя, фінал.



Вельмі важна правільна пабудаваць праграму, каб у гледача з кожным наступным танцам нарасталі станоўчыя эмоцыі, каб ён не толькі разумеў, што адбываецца на сцэне, але і жыў гэтым, радаваўся, захапляўся, перажываў. Нельга, каб усё было манатонным, нібыта гучыць адна і тая ж музыка, толькі мяняюцца касцюмы і танцоры. Таму ў мяне нумары адрозніваюцца адзін ад другога — і па тэме, і па малюнку, і па стылі. І па сэнсе! Мы ж, паўтаруся, робім міні-спектаклі, якія ў цэлым складаюць вялікі, змястоўны спектакль. На сцэне ў нас выступаюць не проста танцоры, а пэўныя персанажы. Каб стварыць яркі, каларытны вобраз такога персанажа, патрабуецца немалое акцёрскае майстэрства.

**— І дзе ж вы такія кадры знаходзіце, каб яны выдатна танцавалі ды яшчэ валодалі акцёрскім талентам?**

— Свае кадры мы рыхтуем самі. Некага знаходзім сярод выпускнікоў харэаграфічнага вучылішча і іншых устаноў мастацтва. Нехта да нас прыходзіць сам. Мы ўсіх праглядваем, аднак бяром далёка не ўсіх. Але нават з тых, каго прымаем, прыжываецца адзін з дзесяці. Справа ў тым, што мы працуем на аснове класічнага танца, а для гэтага неабходна мець вельмі добрую фізічную форму.

**— І, напэўна, не толькі…**

— Безумоўна. Наш артыст абавязаны мець прывабную знешнасць, прыгожую паставу, музыкальнасць, артыстызм. Але найперш пры адборы мы глядзім на фізічныя даныя. Чаму? Таму што танцоўшчыку даводзіцца вытрымліваць дастаткова вялікія нагрузкі. Вы заўважылі, якія шырокія і высокія скачкі выконваюць нашы артысты? А гэта ж дасягаецца няпроста, штодзённымі і нялёгкімі трэніроўкамі, рэпетыцыямі да сёмага поту і мазалёў.

**— А ці былі ў вас выпадкі, калі вы прымалі чалавека, які не меў асаблівага таленту да танцаў, але вельмі хацеў працаваць у «Харошках»?**

— Былі. Мы такім кандыдатам даём шанц, і нярэдка яны яго апраўдваюць. Ды што казаць, хіба ў нашым першым наборы ўсе былі з выдатнымі данымі, неабходнымі для харэаграфіі? Не. Але дзякуючы моцнаму жаданню і выключнаму старанню яны выраслі ў таленавітых танцоўшчыкаў. Яркі прыклад таму — заслужаны артыст рэспублікі Фёдар Балабайка.

**— У калектыве ёсць свае традыцыі, пісаныя і няпісаныя правілы?**

— Безумоўна, ёсць. Галоўная наша традыцыя — добрасумленнае стаўленне да працы. Чалавеку, якога мы прымаем у калектыў, адразу ж даём зразумець, што халтура, гультайства ў нас не праходзіць, ён павінен поўнасцю выкладвацца, паказваць усё, на што здольны.

**— Як вядома, артысты — людзі складаныя, ранімыя, тонкія. Як вы з імі спраўляецеся?**

— Перш за ўсё — я іх люблю. Я за ўсіх іх перажываю, стараюся ўсім дапамагаць. І ў творчым сэнсе, і ў сацыяльным. І яны гэта адчуваюць, адплачваюць мне даверам і павагаю.

**Змітрок ВЕРАС.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЗА ПРАЕЗД — НА 500 РУБЛЁЎ БОЛЬШ

**Кошт праезду ў гарадскім пасажырскім транспарце з 1 снежня павялічваецца да 3 тысяч рублёў — на 500 рублёў. Дарэчы, апошні раз — з 1 кастрычніка — ён падаражэў на такую ж суму: з 2 да 2,5 тысячы рублёў за адну паездку. А дагэтуль кошт праезду змяняўся ажно ў маі.**

Павелічэнне кошту праезду прадугледжана рашэннем Мінгарвыканкама № 2889 ад 25 лістапада. У бліжэйшы час яно з'явіцца на Нацыянальным прававым партале.

Пры рэалізацыі білетаў на адну паездку кіроўцамі ў аўтобусах, трамваях, тралейбусах кошт талончыка павялічваецца на 500 рублёў да ўстаноўленага тарыфу — да 3,5 тысячы рублёў. Праезд у экспрэс-маршрутах будзе каштаваць 4,3 тысячы рублёў.

Кошт праязных дакументаў павялічыцца на 20 працэнтаў, на экспрэс-маршрутах — на 13 працэнтаў. Зрэшты, многія гараджане ўжо загадзя паспелі набыць праязныя на наступны месяц: з канца мінулага тыдня, як толькі з'явілася першая інфармацыя аб магчымым павелічэнні кошту праезду ў гарадскім пасажырскім транспарце, колькасць пасажыраў каля месцаў іх продажу прыкметна павялічылася. Звычайна ж большасць набывае праязныя білеты ў самым канцы бягучага месяца — першых днях наступнага.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У ПОШУКАХ ІНАВАЦЫЙ І НОВЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

**Пашыраны асартымент запушчанай у вытворчасць прадукцыі акцыянернага таварыства «Полацк-Шкловалакно» ўключае больш за 2000 найменняў. Пакупнікамі прадукцыі завода з'яўляюцца прадпрыемствы авіяцыйнай і касмічнай прамысловасці, ваенна-прамысловага комплексу, аўтамабіле- і суднабудавання, будаўнічай галіны і шэраг іншых структур.**

Далейшую стратэгію свайго развіцця «Полацк-Шкловалакно» бачыць ва ўкараненні ў вытворчасць інавацыйнай і запатрабаванай на сусветным рынку прадукцыі са шкловалакна. Сёння спецыялісты прадпрыемства гатовы прапанаваць інвестарам свае ідэі і вытворчыя магутнасці для рэалізацыі шэрагу вельмі цікавых і перспектыўных праектаў па арганізацыі вытворчасці рулонных дахавых матэрыялаў, канструкцыйных шкломатаў (CSM) і шклопластыкавых труб, а таксама камбінаваных нятканых матэрыялаў, паведаміў рэдакцыі **генеральны дырэктар завода Мікалай Аляксандравіч КАЧАНОЎСКІ.**

Учора акцыянернаму таварыству «Полацк-Шкловалакно» споўнілася 55 гадоў. Пройдзены пэўны гістарычны перыяд, адзначаны развіццём вытворчасці, стварэннем новых вытворчых магутнасцяў і асартыментам выпускаемай прадукцыі. За гэты час прадпрыемства заняло ўпэўненыя пазіцыі ў вытворчасці шкловалакна і прадукцыі на яго аснове і сёння карыстаецца шырокай вядомасцю і павагай у партнёраў больш чым з 45 краін свету. Станоўчае развіццё прадпрыемства стала вынікам плённай працы кожнага работніка, а таксама дзякуючы традыцыям і дынастыям вялікага калектыву. Рэдакцыя нашага выдання шчыра віншуе работнікаў гэтага паспяховага прадпрыемства са святам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У МАГІЛЁВЕ ЎКРАЛІ… АЎТОБУС

**29-гадовы жыхар Магілёва сярод белага дня здзейсніў угон аўтобуса «МАЗ-103», які належыць магілёўскаму аўтапарку № 1.**

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці Аксана Салянюк, парушальнікам з’яўляецца кіроўца гэтага ж аўтапарка, які ў свой выхадны дзень прыйшоў на месца працы і сеў за руль чужога аўтобуса. Але далёка ад’ехаць не паспеў. Па дарозе ён не справіўся з кіраваннем, і аўтобус урэзаўся ў слуп, што прыцягнула да сябе ўвагу міліцыі. Але на патрабаванне праваахоўнікаў спыніцца мужчына не адрэагаваў, наадварот, націснуў на газ і пагнаў аўтобус на тое ж самае месца, дзе яго ўзяў. Там парушальнік і быў затрыманы нарадам Кастрычніцкага (г. Магілёва) аддзела Дэпартамента аховы МУС РБ. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па артыкуле 214, ч. 1 — угон транспартнага сродку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ЦЫГАРЭТЫ ЗНОЎ «ДАЮЦЬ ПРЫКУРЫЦЬ»

**З 1 снежня ў краіне ў чарговы раз павялічваюцца максімальныя розначныя цэны на асобныя віды цыгарэт.**

Нагадаем, што айчынныя вытворцы і імпарцёры зараз маюць права штомесячна дэклараваць новыя цэннікі на тытунёвыя вырабы. На гэты раз павелічэнне цэн будзе на 2–14 працэнтаў.

Максімальнае падаражанне закране цыгарэты, якія вырабляюцца ў нас: Camel Filters, Camel Orange, Camel Blue, Camel Silver, якія будуць прадаваць па 13,5 тысячы рублёў за пачак. Кошт Monte Carlo павялічыцца да 8,7 тысячы рублёў за пачак (на 200 рублёў больш, чым было дагэтуль). Glamour з пачатку снежня можна будзе купіць за 12 тысяч рублёў.

Падаражанне закране таксама маркі цыгарэт, што вырабляюцца ў нас (напрыклад, Pall Mall, Winston, Lucky Strike, West, Kent).

Калі гаварыць пра імпартныя тытунёвыя вырабы, што завозяцца, яны тут стануць каштаваць больш (да прыкладу, Dunhill, Camel).

Апошні раз цэны на некаторыя віды цыгарэт павялічваліся ў краіне ў пачатку лістапада. Тады павелічэнне склала 1–30 працэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЛЕПШ УСЁ-ТАКІ ЗАПОЎНІЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ…

Грамадзянін Расіі ехаў праз Брэст за мяжу цягніком. А калі на мытні праверылі яго багаж, там аказалася 40,5 тысячы еўра і 83,3 тысячы расійскіх рублёў. Расіянін ведаў, што грошы ў суме больш за 10 тысяч долараў падлягаюць дэкларыванню. У выніку валюта была канфіскавана, а па сваім маршруце мужчына паехаў з 7,3 тысячы еўра ў кішэні.

Як паведаміў супрацоўнік прэс-службы Брэсцкай мытні Андрэй ДУБІНКА, з пачатку гэтага года работнікамі названай мытні канфіскавана валюты на сем мільярдаў рублёў. Усе гэтыя грошы перавозіліся за мяжу незаконна.

**Яна СВЕТАВА.**

## ЗАКУПАЧНАЯ ЦАНА НА МАЛАКО ВЫРАСЛА

**З сённяшняга дня закупачныя цэны на малако павялічваюцца на 10 працэнтаў.**

Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання №63 ад 20 лістапада, якая было апублікавана на Нацыянальным прававым партале. У самім міністэрстве гавораць, што фіксаваныя цэны на малако, што закупляецца для дзяржаўных патрэб, павышаюцца з мэтай частковага пакрыцця павелічэння кошту матэрыяльных рэсурсаў, якія выкарыстоўваюцца. Цяпер цана на малако гатунку «экстра» складзе 3 млн 891 тыс. рублёў за тону, на малако вышэйшага гатунку — 3 млн 352 тыс. рублёў, на малако першага гатунку — 3 млн 091 тыс. рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Красоўскай Тамары Пятроўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Медыяпрастора

Мікалай ЛІТВІНАЎ:

# АДЫДЗЕМ АД ПАВЯРХОЎНАСЦІ

**З'яўленне новых інфармацыйных прадуктаў, актыўнае развіццё інтэрнэту і стварэнне буйных медыяхолдынгаў — прыкметы нашага часу. Прычым даводзіцца канстатаваць, што імклівыя змяненні адбываюцца як на агульнарэспубліканскім, так і на рэгіянальным рынку СМІ, і аб гэтым — наша гутарка з галоўным рэдактарам газеты «Мінская праўда», старшынёй Мінскай абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў Мікалаем Літвінавым.**



***— Мікалай Пятровіч, якія, на вашу думку, асноўныя тэндэнцыі развіцця рэгіянальных СМІ Міншчыны?***

— Варта ўзгадаць, што ўсе змяненні інфармацыйнай прасторы — патрэба часу, адлюстраванне сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны ў рэчышчы сусветных тэндэнцый. Эканоміка фарміруе соцыум, лад жыцця людзей. У гэтым плане Міншчына, як цэнтральны, шмат у чым вызначальны рэгіён краіны (такую ацэнку вобласці даў кіраўнік дзяржавы), з'яўляецца лакаматывам тых станоўчых працэсаў, што адбываюцца ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. Гэта дакладна разумеюць кіраўніцтва Мінаблвыканкама, мясцовыя ўлады. Зразумела, у флагманскім рэчышчы павінна адбывацца і развіццё СМІ. Тут шырокае поле дзейнасці і вялікія магчымасці.

Сёння інфармацыйную прастору вобласці фарміруюць абласная газета «Мінская праўда», 22 раённыя і жодзінская гарадская газеты, абласная радыёстанцыя «Мінская хваля», рэдакцыі мясцовага вяшчання, 6 рэгіянальных тэлестудый і столькі ж шматтыражных газет. Пры гэтым мы разглядаем гэты магутны рэсурс як адзіны сугучны арганізм. Аб'яднальнай пляцоўкай тут выступае цэнтральнае выданне вобласці «Мінская праўда» і абласная арганізацыя Беларускага саюза журналістаў. Так што мы фактычна працуем ва ўмовах сваёй рэгіянальнай прасторы — пад кіраўніцтвам Мінскага аблвыканкама, супольна з мясцовымі ўладамі. Актыўнае супрацоўніцтва наладжана з рэспубліканскімі органамі ўлады.

Тут яшчэ і геаграфічнае размяшчэнне спрыяе. Я ўпэўнены, што рэгіянальная журналістыка (нікольскі не цураюся такога вызначэння, а нават ганаруся ім) павінна выходзіць на новы ўзровень развіцця, актыўна асвойваць інфармацыйную прастору не толькі свайго рэгіёна, але і даводзіць да сваіх чытачоў, гледачоў, слухачоў як мага больш глабальны кантэнт. Не губляючы пры гэтым сваёй унікальнай пазіцыі — блізкасці да нашых спажыўцоў. Нездарма адзін са слоганаў нашай газеты гучыць так: «Мінская праўда» як добры сусед — заўжды побач». Мы не стаім на месцы, а імкліва крочым наперад. Апошнім часам у развіцці рэгіянальных СМІ ўсё больш выразна прасочваюцца некалькі тэндэнцый: пашырэнне аўтарскай журналістыкі, пераход на сучасны, больш зручны для ўспрыняцця чытачом дызайн перыёдыкі, а таксама новыя падыходы да інтэрнэт-сайтаў выданняў, імкненне да напаўнення электронных варыянтаў у рэжыме анлайн і да большай ступені візуалізацыі пры дапамозе фотаздымкаў, аўдыя- і відэазапісаў. Прычым сёння друкаваныя і інтэрнэт-версіі рэгіянальных газет — ужо далёка не адно і тое ж.

Нарэшце, яшчэ адна новая з'ява — усё больш актыўнае выкарыстанне СМІ магчымасцяў інтэрнэту для зваротнай сувязі з жыхарамі вобласці. І адным з найбольш адметных у гэтым плане стаў інтэрнэт-праект пад назвай «Народны кантроль». Гэта спецыяльны віртуальны сэрвіс, створаны для ўзаемадзеяння сродкаў масавай інфармацыі і грамадскасці Мінскай вобласці. Яго галоўная задача — прыцягненне ўвагі з дапамогай інтэрнэту да фактаў безгаспадарнасці і правапарушэнняў.

Зразумела, асобныя са зваротаў — тэма для журналісцкіх матэрыялаў, магчымасць прыйсці на дапамогу людзям. Журналістыка павінна захоўваць чалавечнасць. Гэты інтэрнэт-праект заклікаiны таксама звярнуць увагу на разнастайныя грамадска значныя падзеі, што адбываюцца на Міншчыне.

***— Усё больш моладзі перакананa, што будучыня — толькі за інтэрнэтам. І што традыцыйная сістэма сродкаў масавай інфармацыі проста не вытрымае канкурэнцыі і з цягам часу знікне...***

— Недаацэньваць магчымасці інтэрнэту нельга — гэта сапраўды магутны камунікацыйны і інфармацыйны рэсурс. І ўсё ж я не стаў бы спісваць з рахункаў традыцыйныя аўдыявізуальныя і друкаваныя СМІ. Нават шчырыя прыхільнікі сецiва прызнаюць, што яно мае шмат недахопаў, і ў першую чаргу гаворка аб вялікай колькасці неправеранай, а часам нават хлуслівай інфармацыі. А плюс да таго інфармацыі вельмі павярхоўнай.

Так, інтэрнэт прапануе шмат навін. Але менавіта іх вялікая колькасць і калейдаскапічнасць вядуць да таго, што большасць такіх паведамленняў на наступны дзень элементарна забываецца з вельмі простай прычыны: спажывец інфармацыі проста не мае часу, каб спыніцца і падумаць.

У гэтым плане традыцыйныя СМІ з падборам найбольш значных звестак, з праверкай іх на сапраўднасць і аналізам падзей маюць бясспрэчную перавагу. І вельмі прыемна, што на змену інтэрнэт-эйфарыі прыходзіць попыт на прафесійную, якасную журналістыку.

***— Але якасць газетных і аўдыявізуальных матэрыялаў у першую чаргу залежыць ад падрыхтоўкі журналіста. Як павысіць яе ўзровень?***

— Напэўна, ніводны чалавек не можа аднолькава добра разбірацца ў эканоміцы, медыцыне, футболе і навінках моды адначасова. А журналісту даводзіцца гэта рабіць літаральна штодня, бо адна з асаблівасцяў яго работы — хуткае пераключэнне на розныя тэмы. Таму адзіны шлях да павышэння прафесійнага ўзроўню супрацоўніка СМІ — пастаянная адукацыя. І ў гэтым выпадку журналісту трэба дапамагаць.

Вось чаму, лічу, адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці Мінскай абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў з'яўляецца правядзенне адукацыйных семінараў для работнікаў рэгіянальных СМІ з удзелам спецыялістаў у тых або іншых сферах. Мы плённа ўзаемадзейнічаем з галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама, увогуле ва ўсіх журналісцкіх справах яны нашы добрыя дарадцы, надзейныя партнёры.

За апошні час з дапамогай абласнога камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а таксама абласнога ўпраўлення МНС мы ўжо наладзілі такія семінары па праблемах дэмаграфіі і асабістай бяспекі грамадзян. Супрацоўнічаем з абласным грамадскім саветам па дэмаграфічнай бяспецы. І падобная практыка супрацоўніцтва працягнецца. Гэта толькі адзін з прыкладаў той работы, якая ладзіцца абласной арганізацыяй БСЖ — дарэчы, адной з самых вялікіх рэгіянальных структур. Радуе тое, што ў бліжэйшай перспектыве нашы шэрагі адчувальна папоўняцца, прыходзіць моладзь. За ёй — будучыня.

**Традыцыйныя СМІ з падборам найбольш значных звестак, з праверкай іх на сапраўднасць і аналізам падзей маюць бясспрэчную перавагу перад інтэрнэтам.**

***— Шлях супрацоўніцтва — прынцыповы?***

— Па сваёй натуры кожны журналіст настроены крытычна. Тым не менш думка, што прадстаўнікі СМІ спрабуюць паўсюль адшукаць выключна негатыў, цалкам памылковая. Абсалютная большасць журналістаў — шчырыя патрыёты Беларусі, яны робяць і будуць рабіць усё, каб кожны грамадзянін нашай краіны ганарыўся ёй, каб развівалася наша эканоміка і наша па-сапраўднаму адметная культура. І тут без супрацоўніцтва з іншымі дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі, якія маюць такія ж мэты, проста не абысціся.

Прычым маю на ўвазе супрацоўніцтва па самых розных кірунках. Для СМІ з'яўляецца аднолькава важным і стварэнне прывабнага інвестыцыйнага і турыстычнага іміджу краіны, і папулярызацыя прадпрымальнасці, і аднаўленне гістарычнай спадчыны, і падтрымка роднага слова. Дарэчы, што да апошняга, то не магу не адзначыць вельмі добрыя стасункі Мінскай абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў і Мінскага абласнога аддзела Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ужо колькі гадоў з мэтай папулярызацыі творчасці сучасных літаратараў Міншчыны на старонках «Мінскай праўды» выходзіць тэматычная старонка «Далягляды». Летась, у год 130-гадовага юбілею з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама 100-гадовага юбілею Максіма Танка мы ажыццявілі сумесную літаратурна-краязнаўчую акцыю «Шляхамі паэтаў». Яна мела вялікі грамадскі рэзананс. Гэты наш праект знайшоў сваё прадаўжэнне.

Напярэдадні 70-годдзя вызвалення Беларусі і Вялікай Перамогі мы наладзілі вандроўку «Шляхамі паэтаў: слова клікала ў бой». У яе межах — сустрэчы з чытачамі, краязнаўцамі, аматарамі роднага слова ў рэгіёнах, звязаных з імёнамі паэтаў-партызан, паэтаў-франтавікоў. Да прыкладу, Анатоля Астрэйкі — у Капылі, Івана Муравейкі — у Любані, Усевалада Сабліна — у Мар'інай Горцы і Рудзенску. У бліжэйшых планах таксама — арганізацыя зноў жа сумеснага конкурсу нарысаў на тэму шматдзетнай сям'і. Прычым вырашана, што пляцоўкай для рэалізацыі гэтага праекта стануць газеты «Мінская праўда» і «Звязда».

**Аляксандр СУШКО**

■ Тэму падказаў чытач

## АПРАНІЦЕ І... УСМІХНІЦЕСЯ

**У сталічным ГУМе прадаецца футболка з зухаватым надпісам: «Выхоўваю дачку, і таму саджаць дрэва і будаваць дом не бачу сэнсу». Мужчына, які гэтую цікавостку заўважыў і распавёў пра яе ў рэдакцыі, быў сапраўды ўзрушаны:**







— Калі чытаем такі надпіс, можна да чаго заўгодна дадумацца! — разважаў ён, маючы на ўвазе шматсэнсоўнасць фразы.

Хто гэты чалавек, што апране на сябе вышэйзгаданую футболку і з якой мэтай ён гэта зробіць? Маладым, можа, і блізкі такі гумар, а людзі сталага веку будуць мець поўнае права ўпікнуць новае пакаленне ў легкадумнасці. Карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да вытворцы футболкі, у адкрытае акцыянернае таварыства «8 Сакавіка»...

Як расказала начальнік аддзела маркетынгу Святлана Дмітрычэнка, з пачатку жніўня прадпрыемства пачало выпускаць серыю мужчынскіх футболак з гумарыстычнымі надпісамі. У месяц шыецца каля тысячы адзінак такой прадукцыі.

— У асноўным мы арыентаваліся на пакупнікоў узростам прыкладна ад 20 да 35 гадоў. І ў моладзі, дарэчы, «гумарыстычная» прадукцыя карыстаецца вялікім попытам. Таксама, магчыма, футболка з жартаўлівым надпісам можа набывацца ў якасці сувеніра, — распавяла Святлана Дмітрычэнка.

На прадпрыемстве вельмі здзівіліся, што надпіс пра дачку выклікаў не надта добрую рэакцыю, і патлумачылі: маўляў, перш-наперш мелі на ўвазе свабоду ўладальніка футболкі ад жыццёвых стэрэатыпаў. Гэта можна, па іх словах, сфармуляваць наступным чынам: «Я не адпавядаю ніводнаму пункту са старога пастулата пра сына, дом і дрэва, але ўсё роўна шчаслівы».

На астатніх футболках з гэтай серыі можна прачытаць такія надпісы: «Студэнт заўжды мае рацыю», «Абанент часова недаступны», «Жыву па сваіх правілах», «Хачу шмат грошай. Працу не прапаноўваць» і інш. Слоганы гэтыя ААТ «пазычылі» з інтэрнэту, на прасторах якога прадаецца шмат «падпісаных» футболак.

Па словах Святланы Дмітрычэнкі, многія пакупнікі былі прыемна ўражаны, што такія рэчы выпускае беларускае прадпрыемства.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

**«ГАРАЧЫ» 287 17 41**

## РАДЫЁВЯШЧАННЕ Ў ВЁСКАХ АБЯЦАЮЦЬ АДНАВІЦЬ

**У адзін дзень з Навагрудскага раёна ў рэдакцыю паступілі два аднолькавыя па змесце званкі ад розных людзей: не працуе радыё.**

**— Вы ж ведаеце, што такое радыё для вясковага чалавека? Людзі ж пад яго прачынаюцца, пад яго кладуцца спаць. Цэлы дзень слухаем навіны, музыку. А яно ў нас маўчыць: электрыкі паабрывалі правады. Праблема датычыцца вёсак Пантусавічы і Загор'е-Сеннецкая, — паскардзілася першая заяўніца.**

**Праз нейкія паўгадзіны патэлефанавала яшчэ адна жыхарка Пантусавічаў, якая ўдакладніла, што радыё не працуе ўжо з месяц. «Нам жа не грошай тых невялікіх шкада. Няхай бы радыё аднавілі! А нам кажуць, што яно ўвогуле з новага года працаваць не будзе, таму і сэнсу тыя абарваныя правады аднаўляць няма. Дык як жа гэта?»**

Як можна было зразумець, нашы заяўнікі, напэўна, ведаючы пра маючыя адбыцца планы па скасаванні праваднога радыё ў краіне, тым не менш вырашылі, што радыё... не будзе зусім. Так, раней было агучана, што праваднoe радыёвяшчанне ў Беларусі будзе адключана да канца 2014 года. Пачаць гэты працэс планавалася з Гродзенскай і Мінскай абласцей, пакрысе па раёнах адключаючы яго да поўнага завяршэння работ у цэлым. Уладальнікам радыёкропак планавалася прадаставіць УКВ-прыёмнікі. Адключэнне ж было абумоўлена тым, што такая тэхналогія перадачы інфармацыі састарэла і, як тлумачылася, рэнтабельнасць гэтай паслугі вымушае жадаць лепшага. Праўда, выказваліся і сумненні ў мэтазгоднасці такога кроку... Тым не менш, калі меркаваць па словах заяўнікаў, складвалася ўражанне, што працэс, як і было абяцана, «пайшоў»...

Мы патэлефанавалі ў Навагрудскі раённы вузел электрасувязі. Трубку зняў яго начальнік Мікалай Пучыла. Пачуўшы пераказ скаргі вяскоўцаў з Пантусавічаў, суразмоўца сказаў, што нічога не ведае аб гэтай праблеме, папрасіў трохі часу, каб разабрацца ў сітуацыі.

Раніцай наступнага дня Мікалай Іванавіч перазваніў у рэдакцыю сам і коратка паведаміў наступнае. Паводле яго слоў, у тым, што ў Пантусавічах і Загор'і-Сеннецкай (а праблема закранула толькі два гэтыя населеныя пункты) не працуе радыё, «вінаватыя электрасеткі, якія вядуць работы. Як запэўніваюць іх прадстаўнікі, апошнія будуць завершаны да 15–20 снежня». Пасля гэтага, сказаў Мікалай Іванавіч, праваднoe радыёвяшчанне ў вёсках будзе адноўлена. Што тычыцца аплаты за гэты час «прастою», начальнік раённага вузла электрычнай сувязі гэтак жа коратка адказаў, што «паколькі радыёкропкі маўчаць, значыць, і плаціць не трэба». Паведаміць штосьці пра адключэнне ў раёне праваднога радыёвяшчання ў кантэксце вышэйпрыведзенай інфармацыі на гэты конт суразмоўца адмовіўся, спаслаўшыся на занятасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Як трапіць у «гісторыю»

**Каб стаць вядомым, стагоддзе таму трэба было трапіць у крымінальную зводку. Сёння — таксама.**

Калісьці наш сусветна вядомы калега Антон Чэхаў, добра знаёмы з майстэрствам апрацоўкі міліцэйскіх пратаколаў, так паклаў на паперу прыгоды аднаго маладога чалавека (вельмі скарочана):

«29-га снежня, у адзінаццаць гадзін вечара, калежскі рэгістратар Дзмітрый Кулдараў... выходзячы з портарнай, што на Малай Броннай, у доме Казіхіна, і знаходзячыся ў нецвярозым стане... паслізнуўся і зваліўся пад каня... Спалоханы конь панёсся па вуліцы і быў затрыманы дворнікамі. Кулдараў, спачатку знаходзячыся ў непрытомнасці, быў адведзены ў паліцэйскі ўчастак і агледжаны лекарам. Удар, які ён атрымаў па патыліцы... аднесены да лёгкіх. Пра здарэнне складзены пратакол...»

Зусім нічога з сучаснага інфармацыйнага поля вам не нагадвае?

Тады яшчэ адна агульнавядомая гісторыя:

«Трапіў пад каня. Учора на плошчы Свярдлова трапіў пад каня возчыка № 8974 гр. А. Бэндар. Пацярпелы абышоўся лёгкім спалохам...»

А зараз сучаснае «дэжа вю» з варыяцыямі.

«У беларускім Жлобіне «звар'яцелая калясніца» затаптала іншамарку. Запрэжаны ў воз конь не ўпісаўся ў паварот і на вялікай хуткасці літаральна пратараніў аўтамабіль. Гэты момант зафіксаваў відэарэгістратар. За некалькі дзён відэа набрала 414 тысяч праглядаў на партале YouTube. Па інфармацыі ДАІ, хтосьці з кіроўцаў націснуў на клаксон. Конь спалохаўся і панёс. На скрыжаванні ён заскочыў на аўтамабіль КІА, які спыніўся на забараняльны сігнал святлафора. У выніку ДТЗ іншамарка атрымала пашкоджанні, а воз разваліўся. У той момант, калі конь асядлаў КІА, у возе знаходзіліся двое мужчын. Яны вываліліся, але пацярпелых няма. Конь таксама цэлы. У дачыненні да возчыка — 30-гадовага мясцовага жыхара — складзены адміністрацыйны пратакол за парушэнне ПДР, якое пацягнула пашкоджанне транспартнага сродку».

Камічна-драматычнае здарэнне трапіла ў поле ўвагі расійскага шоу «Вячэрні Ургант». А гэта ўжо як мінімум еўразійская папулярнасць! Расійскі гумарыст агучыў ролік мелодыяй з «Няўлоўных мсціўцаў» і жартамі: «Горад Жлобін. Ніколі не ведаеш, што прыляціць табе ў лабавуху».

Жарты пра каня са Жлобіна працягваюць распаўсюджвацца з хуткасцю гуку па неабсяжнай віртуальнай прасторы. Пайду купляць відэарэгістратар. Можа, і мне пашанцуе трапіць у гісторыю? Ці ўсё ж будзе лепш, калі такая слава абыдзе бокам?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Размовы на кухні

# ГАБСЭК БЫ ПАЗАЙЗДРОСЦІЎ

**Ужо традыцыйна напрыканцы года ў інтэрнэце з'яўляюцца чуткі аб тым, што нашу краіну напярэдадні навагодніх свят або непасрэдна пасля Новага года чакаюць глабальныя фінансавыя ўзрушэнні. Асобныя «хатнія» аналітыкі прадракаюць імгненную гіперінфляцыю, дэвальвацыю, дэнамінацыю, увядзенне новых грошай і іншыя «страшныя» з'явы. Што ў гэтым выпадку робіць звычайны беларус? Уладальнікі нават невялікіх грашовых зберажэнняў нервова шукаюць шляхі выгаднага ўладкавання сваіх кроўных... Мы былі сведкамі, калі пэўная частка насельніцтва набывала ў неабмежаванай колькасці прадукты харчавання, бытавую тэхніку, золата, валюту і гэтак далей. У нашым матэрыяле мы паспрабуем разабрацца ў мэтазгоднасці падобных укладанняў.**

**У. К.** — Вой, Сяргей Андрэевіч, неяк здаецца мне, што вашы карані недзе пад Брэстам. Надта ад вас «заходнікам цягне» — усё пра сябе, ды пра сябе. Першы раз такіх адзінаасобнікаў бачу, як казалі ў добрым фільме. А вы аб краіне падумалі? Для нашай прамысловасці, мяркую, такі ажыятажны попыт толькі на шчасце. Глядзіш, і склады ўсе разгрузім хутчэй. Чым гэта дрэнна?

**С. К.** — Гэта так. Але памятаеш, як нам заўсёды банкаўскія аналітыкі раілі захоўваць грошы? Успомніў? Так — у розных валютах. Частка, вядома, у нацыянальнай валюце (пад той самы вялікі працэнт), другую частку, мабыць, у доларах, бо нейкія сур'ёзныя пакупкі ў нас традыцыйна набываюцца за «баксы». Нядрэнна было б мець і еўра (вунь як яно расце апошнім часам), а таксама расійскія рублі — на ўсялякі выпадак, тым больш у Саюзнай дзяржаве жывём.

**У. К.** — Дакладна! Вось зараз пайду і накупляю «баксаў» ды еўра на ўсе грошы і разапхну па панчохах і падушках.

**С. К.** — А вось гэтага і не трэба. Грошы на эканоміку працаваць павінны. Ды і табе, дурню, даход прыносіць. Зразумела, у банках цяпер валютныя дэпазіты маюць вельмі маленькі працэнт. Але ёсць іншыя варыянты. Напрыклад, дзяржаўныя валютныя аблігацыі ў насельніцтва летась добры попыт мелі. Буйныя банкі таксама свае валютныя аблігацыі прапануюць — не на горшых умовах. Няхай гэта толькі 7 працэнтаў, але галава чуткамі пра дэвальвацыю ўжо і не забіта. Сур'ёзныя грошы ўвогуле трымаць у кватэры небяспечна. Галоўнае — вызначыцца з прапорцыямі «запасаў»: напрыклад, калі ты вырашыш праз нейкі час набыць айчынную мэблю ці тэхніку, то лепш большы «кавалак» зберажэнняў трымаць у рублях. Словам, трэба думаць катэгорыямі збалансаваных інтарэсаў. А калі збіраешся летам адпачыць за мяжой, тады трэба звяртаць увагу і на іншыя валюты.

**У. К.** — За «дурня» дзякуй... Але ж вы таксама не ўсё пралічылі. Не падабаецца мне гэтая «варожая» валюта — у іх там не ўсё так салодка, як здаецца на першы погляд. Беспрацоўе, праблемы з міграцыяй, пагрозы дэфолту ў асобных краінах Еўрасаюза. Штаты друкуюць свае долары, як звар'яцелыя, ніяк не забяспечваючы іх ростам эканомікі, а мы іх купляць павінны? Але долар хаця б найстарэйшая глабальная валюта. А ці варта купляць еўра, якому прадракаюць хуткую смерць нават самі члены еўразоны? Куды вы пасля запхняце гэтыя паперкі?..

**С. К.** — Пустыя паперкі нікому не патрэбны. Тут я з табою часткова згаджуся. Мне здаецца, што праўда недзе пасярэдзіне. Лухта ўсё гэта наконт накаплення вялікіх грошай ці цэлых скрыняў ежы. Праходзілі мы ўжо гэта. Трэба старацца менавіта цяпер жыць годна — хадзіць у тэатры, займацца спортам, цывілізавана адпачываць, не шкадаваць грошай на адукацыю сваіх дзетак... А апошніх няхай будзе шмат. Адным словам, укладваць грошы ў жыццё.

**У. К.** — І тое праўда.

### Аматарам молі прысвячаецца

**С. К.** — Тым, хто ўсё ж такі вырашае ўкладваць свае «каштоўныя паперкі» ў ежу, трэба ведаць, што ваша кватэра не з'яўляецца безразмерным складскім памяшканнем. Некалькі гадоў таму ў асобных дамах, якія былі завалены мяхамі з цукрам, заводзіліся не толькі мышы, але і пацукі. А ў гарадскіх кватэрах скрыні з макаронай пераўтвараліся ў цудоўную сталоўку для молі. Гэта і зразумела, бо сярэдняя сям'я не можа з'ядаць па пяць кілаграмаў макароны за адзін раз.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У. К.** — Згодны. Але ж можна зрабіць прыпасы з рыбных і мясных кансерваў. Да іх моль ніяк не дабярэцца! І пацукі такую шклянначку зубкамі не возьмуць...

**С. К.** — Так-так. Уладзя, мая жонка таксама думала, што разумнейшая за ўсіх. Днямі я рабіў рэвізію кухонных шафак, дзе выявіў некалькі бляшанак з печанню траскі, у якіх тэрмін прыдатнасці скончыўся ўжо год таму. І куды ты думаеш яны адразу ж паляцелі? Вядома, у сметніцу. А яшчэ на вопыце свайго суседа я ведаю, што моль вельмі любіць грэчку, манку, рыс, ды амаль усе крупы. Суседа не выратоўвала нават тое, што ён хаваў іх у трохлітровыя слоікі. Ты не паверыш: моль з лёгкасцю прагрызала пластыкавыя вечкі.

**У. К.** — Чаму ж не паверу? Мне толькі нядаўна бабуля казала, што немагчыма доўга захоўваць манныя крупы — праз некалькі дзён пасля адкрыцця ўпакоўкі там заводзяцца лічынкі. І зрабіць з гэтым, на яе думку, нічога немагчыма. А прадаюць крупы толькі кілаграмовымі пачкамі... Аднак ёсць і іншая «натуральная валюта» — мяса! Памятаеце, як людзі панакуплялі маразільнікаў? А зараз гэта, мабыць, увогуле актуальна. Невядома, што з гэтай свінінай ды ялавічынай будзе пасля таго, як па краіне прайшлася афрыканская чума. А тут на табе — цэлы маразільнік запасаў. А можа, і два...

**С. К.** — Ага. Гэта пры захаванні ў прамысловых халадзільніках тэрмін прыдатнасці сырога мяса можна падоўжыць на паўгоддзе. Не ведаю, як ты, а я ўвогуле люблю мяса не «пенсійнага ўзросту». А яшчэ адкажы мне: куды ты іх паставіш? Добра так будзе глядзецца пара маразільнікаў замест кніжнага століка ў зале. Ці лепш схаваць іх у спальні, каб уначы падскокваць, калі ён пачынае працаваць? Гэта на першы погляд здаецца, што маразільнікі есці не просяць. Электрычнасць ён жарэ, як той Гарганцюа.

### Трэці пыласос у гаспадарцы замінаць не будзе?

**У. К.** — Ну добра, добра. Лічыце, што пераканалі. Пакуль... А калі ўспрыняць тыя ж маразільнікі ці якую іншую тэхніку ў якасці доўгатэрміновага і «дальнабачнага» інвеставання? Грошы абясцэняцца з-за інфляцыі, а так новая пральная машына будзе радаваць сям'ю чыстым адзеннем. Няхай нават будуць куплены дзве машыны — раптам ажэняцца дарослыя дзеці, дык і тым будзе што ў сваёй новай хаце паставіць.

**С. К.** — Часткова я з табою згаджуся. Але ў нас на двары не ліхія 1990-я, калі з рук або на рынку можна было прадаць ці купіць халадзільнік, тэлевізар... ды ўсё, што заўгодна. Можа быць, табе ў хаце і тры пыласосы лішнімі не будуць. Ага, дзецям пакінеш, унукам... А цяпер успомні, якім быў пыласос трыццаць гадоў таму. Ты гэтай «іерыхонскай трубой» зараз наўрад ці карыстаўся б. Я ўпэўнены, што праз некалькі гадоў сусветная прамысловасць народзіць шмат чаго новага. У тым ліку пральную машыну з галасавым упраўленнем. А твае дзеткі на гэты бытавы «антыкварыят» нават не глянуць.

**С. К.** — Не зусім гэта так. Любой вытворчасці, нават нашай, добра толькі тады, калі на рынку існуе стабільны попыт. А вось пасля «масіўнай закупкі» абавязкова прыйдзе мёртвы сезон. Бывай тады, рытмічная праца прадпрыемстваў. Адзінае, што і сапраўды прыцягвае ў падобным «хапуне», тычыцца паляпшэння жыцця гаспадынь. У гэтым выпадку нават самы злосны скнара купіць патрэбны сям'і кухонны камбайн, памяняе савецкую газавую пліту на сучасную, магчыма, зробіць рамонт у кватэры.

### Стаць нумізматам сучасных валют?

**У. К.** — Ну ніяк вам не дагадзіць. Кажаце, рамонт? Ды цяпер нават не шыкоўны рамонт усе вашы грошы з'есць і не задушыцца. А ўвогуле людзі ў Заходняй Еўропе сёння эканомяць на ўсім, бо крызіс — ні ў нармальны адпачынак не з'ездзяць, ні лішняга «Бэнтлі» не купяць. Яны грошы збіраюць. Назапашваюць, мабыць, на чорны дзень. Але, разумееце, у іх працэнты па ўкладах такі-і-я мізэрныя... Я ўвогуле чуў, што яны могуць хутка стаць адмоўнымі. А ў нас дэпазіты якія? Пад 50 працэнтаў ужо. Такія шалёныя грошы еўрапейцам і не сніліся! Дэвальвацыі не абяцаюць, а значыць, можна нядрэнна падзарабіць...

**P.S.** *Аўдыязапіс размовы вы можаце знайсці на zviazda.by.*

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

*Збудзем злыбеду-бяду —*
*Будзе мова ў модзе!*
*Выбірай, народ, «Звязду»*
*І ў новым годзе!*

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

**Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2014 года!**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

# ПРАРВАЦЦА ПРАЗ ЦІШЫНЮ

**Сярод нас жыве шмат людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Праблемы са здароўем у кожнага з іх розныя. Але пераважна яны звязаны з органамі адчуванняў. Класічны прыклад гэтага мы бачым, калі па вуліцы ідзе невідушчы чалавек у чорных акулярах з белым кіем. Аднак куды радзей мы заўважаем у натоўпе тых, хто мае праблемы са слыхам. Хаця гэтым людзям таксама няпроста: ад прыроды яны збольшага пазбаўлены хараства музыкі, птушыных спеваў… Але не здаюцца і знаходзяць сябе ў іншых сферах жыцця. Каб упэўніцца ў гэтым, карэспандэнты «Звязды» выправіліся ў сталічную школу-інтэрнат № 13.**



Першае, што прыкмячаем, — гэта даволі павольны тэмп гаворкі школьных педагогаў. На гэта ўплывае спецыфіка навучальнай установы. Справа ў тым, што людзі, якія маюць пашкоджаны слых, у значнай ступені арыентуюцца на артыкуляцыю і рухі вуснаў субяседніка.

## Працоўная кніжка — ужо ў 14 гадоў

У звычайных школах ды гімназіях урокі працоўнага навучання не выходзяць далей за заняткі ў майстэрнях. Школа-інтэрнат жа на гэтым фоне стварае моцны кантраст. Ужо больш за 10 гадоў у ёй існуе другасная працоўная занятасць, якой ахоплены ўсе вучні. Чатырнаццацігадовыя падлеткі атрымліваюць падрабязныя медыцынскія даведкі, у якіх пазначаны тыя сферы, дзе яны могуць працаваць. Бацькі даюць пісьмовы дазвол — і пасля гэтага маладога чалавека ці дзяўчыну прымаюць на працу, заключаюць з ім працоўны дагавор. Усё як і ў звычайным жыцці. Толькі вось пасля трох месяцаў працы ім прадастаўляюць аплачаны 9-дзённы адпачынак.

— Тут мы даём дзецям элементарныя працоўныя навыкі, якія спатрэбяцца ў будучыні. Дзяўчаты шыюць начныя сарочкі, спадніцы, пасцельную бялізну, шторы, фартухі, мяккія цацкі, хусцінкі — адным словам, усё, што спатрэбіцца будучай хатняй гаспадыні, — гаворыць дырэктар школы-інтэрната № 13 Галіна Гурбо. — Гэтыя віды вышыўкі выбраны не проста так, а пасля кансультацый з медыцынскімі спецыялістамі. Справа ў тым, што вязанне на спіцах добра развівае дробную маторыку пальцаў, а гэта, у сваю чаргу, дазваляе палепшыць маўленне. Дзеці адносяцца да сваіх твораў вельмі беражліва, бо на сабе спазналі, колькі часу і намаганняў было на гэта выдаткавана. І, вядома ж, атрымліваюць бясцэнны вопыт атрымання сваіх першых зароблених грошай!

Сёння ў школе працуюць дзве брыгады, падзеленыя ў асноўным па гендарным прынцыпе: швачкі і рабочыя па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Педагогі выступаюць за тое, каб спектр прафесій пашыраўся. У мэтах — стварэнне брыгады сталяроў, слесараў, каб выконваць дробныя работы па доме.

— Дзіўна, але вельмі мала старшакласнікаў матывавана на атрыманне вышэйшай адукацыі, — працягвае Галіна Гурбо. — Нашы дзеці хочуць быць рабочымі. Пасля школы юнакі, якія маюць праблемы са слыхам, ідуць пераважна на так званую «шумную» вытворчасць, дзе чалавеку з нармальным слыхам было б не зусім камфортна, — у машынабудаванне, дрэваапрацоўку. Дзяўчаты ж хочуць быць цырульнікамі, кухарамі, дызайнерамі, мадэльерамі… А першыя крокі да гэтага яны робяць у кабінеце працоўнага навучання. Многія з іх запісваюцца ў гурткі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Юны ўмелец», «Бісерапляценне».

## «Ціхая» Алімпіяда

За перыпетыямі Алімпійскіх гульняў у свеце могуць адначасова назіраць мільярды чалавек. Крыху менш вядома Паралімпіяда, у якой удзельнічаюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Карцінку з іх убачыць ужо цяжэй, аднак імёны спартсменаў больш-менш вядомыя. І ўжо вельмі рэдка згадваюцца гульні Дэфлімпійскія, на якіх збіраюцца выключна людзі з праблемным слыхам.

Перад уваходам на спартыўную пляцоўку школы-інтэрната знаходзіцца сапраўдная Зала славы. Яе ўпрыгожвае безліч залатых кубкаў, здабытых навучэнцамі ў камандных спаборніцтвах на самых розных узроўнях — ад гарадскіх да міжнародных. Сёлета ў Сафіі прайшлі XXII Дэфлімпійскія гульні, на якіх каманда з 48 спартсменаў заняла выніковае чацвёртае месца. Былі сярод іх і выпускнікі школы-інтэрната: Н. Дзеева, І. Грэсь, А. Таранаў, Т. Чабатарова (Папкова), Г. Козіч (Селіванава), Ю. Кастраміна, М. Грэсь, М. Барысевіч, В. Гакуць, К. Канаш, А. Лагадзюк, Н. Клімовіч… Дэфлімпійцы Беларусі заваявалі цэлы россып медалёў — дванаццаць залатых, адзінаццаць сярэбраных і чатыры бронзавыя. Нашы спартсмены тут здолелі абысці нават каманды Кітая і ЗША! А выпускніцы школы-інтэрната Галіна Козіч і Таццяна Чабатарова сталі рэкардсменкамі свету — у эстафеце 4х400 м і 4х100 м.

— На жаль, дрэнны слых не лепшым чынам адбіваецца на фізічнай падрыхтаванасці вучняў у параўнанні са звычайнымі дзецьмі, — канстатуе настаўнік фізічнай культуры Тамара Малахава. — Ім трэба вучыцца быць больш лоўкімі, развіваць хуткасць рухаў, сілу — адным словам, пастаянна працаваць. Усё гэта ўзаемазвязана — пры паляпшэнні гаворкі становіцца лепшай каардынацыя рухаў, і наадварот. Атрымліваецца такое своеасаблівае замкнёнае кола. Пераадольваецца яно, сярод іншага, каманднымі гульнямі — валейболам, баскетболам…

Працуем мы па той жа праграме, што і агульнаадукацыйныя школы. Але спецыфіка навучання ўсё ж накладвае на нас адбітак. Калі ў простым класе, як правіла, у спартыўны зал адначасова прыходзяць 20–25 дзяцей, то ў нас іх не больш за 12. Таму інтэнсіўнасць працы куды вышэйшая, што дапамагае падыходзіць да кожнага вучня індывідуальна. Настаўніку трэба праяўляць творчы падыход, прыдумваць нейкія нестандартныя хады… І самае галоўнае — зацікавіць спортам як мага раней. Бо падлетка ўцягнуць у спорт з нуля ўжо куды цяжэй не толькі фізічна, але і маральна.

## Незвычайныя прадметы ў школьным раскладзе

На першы погляд, расклад заняткаў у школе-інтэрнаце істотна не адрозніваецца ад агульнаадукацыйных школ. Але тут можна заўважыць нязвыклыя прадметы — «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка», «Жэставая мова», «Развіццё вуснай мовы і слыхавога ўспрымання»… Для дзяцей, якія дрэнна чуюць, распрацавана спецыяльная методыка, накіраваная на амаль цалкам візуальнае ўспрыманне інфармацыі. Тым не менш, яна дазваляе будучым абітурыентам канкурыраваць пры паступленні ва ўніверсітэты на роўных. Так, летась два выпускнікі школы-інтэрната здолелі паступіць у Маскоўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя Н. Э. Баўмана, які лічыцца адной з прэстыжнейшых ВНУ Расіі.

Успомніце з маленства, як вас вучылі арыентавацца сярод шматлікіх хатніх рэчаў бацькі? Яны называлі нейкі прадмет і прасілі штосьці з ім зрабіць — пакратаць, прынесці, пераставіць… А вось чалавеку, які дрэнна чуе, растлумачыць назвы рэчаў такім чынам ужо немагчыма. Таму спецыялісты пайшлі па іншым шляху. У прасторным кабінеце сацыяльна-бытавой арыенціроўкі на паліцах стаяць разнастайныя муляжы звычайных у побыце і апісаных у літаратурных творах рэчаў. Усе прадметы падпісаны вялікімі тлустымі літарамі.

— Гэты прадмет выкладаецца толькі ў пачатковай школе, калі дзеці актыўна назапашваюць лексічны запас. Дзеці тут могуць працаваць як ім заўгодна — і за сталом, і на дыване, — гаворыць намеснік дырэктара па вучэбнай працы Ала Дранчук. — Аднак не ўсё проста і тут. З першымі цяжкасцямі мы сутыкаемся, калі тлумачым словы, якія маюць часовыя абстрактныя паняцці. Калі слова «тапкі» яшчэ зразумела, то ўжо падчас тлумачэння прызначэння вусцілак узнікаюць пытанні.

— Шмат гадзін у навучальнай праграме адведзена на карэкцыйны кампанент. Інакш кажучы, гэта заняткі па развіццю вуснай мовы і слыхавога ўспрымання, — расказвае настаўнік-дэфектолаг Наталля Валянкова. — Велізарны матэрыял назапашаны па кожным гуку, націску, інтанацыі, лагічных звязках. І, вядома ж, нам вельмі дапамагае камп'ютарная тэхніка.

Цэнтрам каардынацыі працы педагогаў школы-інтэрната стаў кабінет слыхавой работы. Ён абсталяваны спецыяльным камп'ютарным маўленча-слыхавым трэнажорам. Пасля збору ўсіх неабходных даных на кожнага вучня ствараецца віртуальная картатэка, з дапамогай якой і пралічваецца далейшая карэкцыйная работа.

— Такім чынам, тут праяўляецца максімальна індывідуальны падыход, — гаворыць настаўнік-дэфектолаг Тамара Шальпук. — Спецыяльныя камп'ютарныя праграмы вучаць правільна вымаўляць гукі і ўспрымаць іх на слых. Кожнае працоўнае месца абсталявана навушнікамі і мікрафонам — зусім як у радыёстудыі!

## Інтэрнацыянальная бязгучная мова

Уявіце сабе, што вы паехалі за мяжу. Каб гутарыць з тамтэйшымі людзьмі, вам трэба або вывучыць якуюсьці з міжнародных моў, або загадзя набыць размоўнік. І ўсё роўна паміж вамі будзе захоўвацца камунікатыўны бар'ер, калі толькі вы не валодаеце віртуозна патрэбнай мовай. А вось, людзі, якія дрэнна чуюць, выдатна разумеюць сваіх глухіх таварышаў нават з далёкіх краін замежжа. І прычына тут простая: яны ведаюць жэставую мову.

— У інтэрнаце працуе нават студыя песні «Зачараваныя жэстам», — расказвае Галіна Гурбо. — Але само выкладанне жэставай мовы з'явілася ў раскладзе заняткаў не так даўно… Праходзіць урок адзін раз на тыдзень. Ён быў уведзены за кошт адной гадзіны рускай мовы. Сапраўдным падзвіжнікам на гэтай глебе стаў настаўнік Уладзімір Мелехавец, які не адзін год вядзе працу па папулярызацыі гэтай бязгучнай мовы. Зараз ён рыхтуе міжнародны слоўнік жэстаў. Ён адзін са стваральнікаў праграмы на тэлеканале «Жэст», які рэтранслюецца ў сталічнай кабельнай сетцы. На гэтым канале і будзе паступова прэзентаваць свой слоўнік. Людзей з дрэнным слыхам можна назваць у добрым сэнсе ўпартымі. Нягледзячы на тое, што іх такім чынам абдзяліла прырода, яны імкнуцца жыць так, як і ўсе мы. І ўжо толькі за гэта заслугоўваюць павагі. І паразумення!

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

### Даведка «Звязды»

***Дэфлімпійскія гульні вядуць адлік гісторыі з 1924 года. Тады ў Парыжы адбыліся першыя сусветныя гульні людзей з парушаным слыхам. Першапачаткова яны ўваходзілі ў склад вядомых усім Паралімпійскіх гульняў. Але ў гэтых людзей быў парушаны толькі слых. А той жа апорна-рухальны апарат быў у спартсменаў параўнаўльна ў норме. І таму яны пачалі заваёўваць адзін залаты медаль за другім. Інтрыга забівалася ледзьве не на карані, і цікавасць да гульняў паступова пачала зніжацца, бо выяўленне пераможцы станавілася фактычна сакрэтам палішынэля. Таму чыноўнікі ад сусветнага спорту вырашылі адасобіць удзельнікаў, якія слаба чуюць.***

***Дэфлімпійскія гульні праходзяць адзін раз у чатыры гады. Ад Алімпійскіх яны адстаюць на год. А прычына гэтага самая банальная — фінансы. Даволі накладна праводзіць у адзін год і Алімпійскія, і Паралімпійскія, і Дэфлімпійскія гульні.***







■ Гісторыі ў смартфоне

# БЕЛАРУСКІЯ КАЗКІ ЗМОГУЦЬ ЧЫТАЦЬ ВА ЎСІМ СВЕЦЕ

**Адмысловы падарунак да Каляд зможа атрымаць беларуская дзятва, чые бацькі карыстаюцца планшэтамі і смартфонамі Apple. Рыхтуецца да запуску праграма для мабільных прылад «Кнігі дзеткам» — віртуальная палічка з казкамі народаў свету, пры дапамозе якой можна будзе чытаць і слухаць казкі на беларускай і англійскай мовах. Першымі на палічку дададуць казкі з яркімі ілюстрацыямі для дзетак 2–4 гадоў.**

Мабільныя прылады цяпер ёсць амаль у кожнага. І малеча часам засвойвае іх хутчэй за дарослых, бо бацькі даюць іх дзецям, каб тыя гуляліся. А неўзабаве з'явіцца магчымасць яшчэ чытаць і слухаць казкі пры дапамозе дэвайсаў.

— «Кнігі дзеткам» — гэта ўнікальны для Беларусі праект, які фактычна ствараецца ў рэальным часе, — распавяла «Звяздзе» каардынатар праграмы Таццяна Цуканава. — Ён уяўляе сабой частку вялікага культурнага праекта, створанага людзьмі з розных краін. Над ім працуюць аўтары, перакладчыкі, ілюстратары, дызайнеры, дыктары, гукарэжысёры і, безумоўна, праграмісты. Ужо існуюць руская, польская, украінская, нямецкая, в'етнамская палічкі. Цяпер рыхтуюцца французская і грэчаская. Мы ствараем беларускую.

Сёння каманда беларускай палічкі перакладае і агучвае казкі сучасных расійскіх аўтараў. Бо сэнс такой своеасаблівай міжнароднай дзіцячай бібліятэкі ў тым, што беларускія кнігі будуць перакладацца на мовы ўсіх філіялаў. Такім чынам, нашы народныя і аўтарскія казкі змогуць чытаць дзеці з іншых краін на сваёй мове. А беларускія дзеткі, акрамя сваіх, атрымаюць магчымасць прачытаць ці паслухаць казкі іншых народаў свету на роднай мове. Да таго ж у дадатку будзе прадугледжана функцыя пераключэння моў з беларускай на англійскую. Таксама можна будзе выбраць фармат кнігі — з агучваннем ці без.

— Усе ўладальнікі прылад на базе iOS змогуць запампаваць сабе дадатак у выглядзе кніжнай паліцы. Некаторыя казкі будуць бясплатнымі, іншыя — платнымі, але кошт будзе невысокім. Ніякіх спецыяльных настроек для таго, каб пампаваць казкі, не спатрэбіцца, — паведаміла Таццяна Цуканава.

Над агучваннем беларускіх аўдыяверсій казак працуюць музыкант, тэлевядучы і мастак Андрусь Такінданг і даследчыца архаічных спеваў Руся.

— Я вельмі рада далучыцца да такой працы, бо лічу, што культурныя праекты на беларускай мове — гэта важна, — падзялілася спявачка. — Здорава, што беларускамоўны культурны кантэнт з'яўляецца ў сучаснай форме, што ён зроблены з густам і розумам. Шкада, што пакуль гэта ўсё проста добраахвотная праца каманды людзей, якія разумеюць узаемасувязь культурнага выхавання і сацыяльна-палітычнага жыцця чалавека. Але такіх ініцыятыў з'яўляецца ўсё больш. Асабіста мне было цікава працаваць над праектам. Я вельмі люблю агучваць менавіта дзіцячыя фільмы і мультыкі. Пасля такой агучкі на ўвесь дзень настрой становіцца па-дзіцячаму шчаслівым.

Цяпер каманда праекта «Кнігі дзеткам» знаходзіцца ў пошуку распрацоўшчыка андроід-версіі, каб кнігі былі даступнымі большай колькасці дзяцей. Дарэчы, усе будучыя чытачы могуць паўплываць як на знешні выгляд дадатку, так і на яго змест. Аўтары заахвочваюць усіх выказваць свае меркаванні на старонках праграмы ў сацыяльных сетках. Можна дапамагчы выбраць знешні выгляд іконкі, а таксама падзяліцца сваімі ўлюбёнымі беларускімі казкамі, каб яны трапілі на палічку.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 412/С-23409 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание сепараторного отделения), площадью 242,3 кв.м, с пристройкой** |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Мостовский р-н, а.г. Лунно, ул. Гродненская, д. 8 |
| Земельный участок | Кадастровый номер 424082706601000553, площадью 0,1386 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания свинарника) |
| Начальная цена продажи | 57 052 800 (пятьдесят семь миллионов пятьдесят две тысячи восемьсот) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 5 705 280 (пять миллионов семьсот пять тысяч двести восемьдесят) белорусских рублей |
| Продавец | ОАО «Щучинский маслосырзавод», 231513, г. Щучин, ул. 17 Сентября, 45, тел.: 8-01514-270-82 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 11 декабря 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.06.2013 г. № 100 (27465).**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 5 декабря 2013 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**


■ Фестываль

# КАЛІ КУЛЬТУРА ЯДНАЕ

**Прадстаўнікі 10 нацыянальнасцяў з 9 рэгіёнаў Міншчыны збяруцца ў Маладзечне на юбілейным Х абласным фестывалі нацыянальных культур 30 лістапада.**

Фестываль дэманструе дасягненні творчасці розных народаў, якія жывуць у цэнтральным рэгіёне. Многія ўдзельнікі сябруюць з музычным форумам з самага пачатку яго заснавання. Гэта Арцём Ахпаш і Артур Міхайлаў (Беларускае грамадскае аб'яднанне грэкаў «Пелапанес»), Дзмітрый Рудык (Маладзечанскае культурна-асветніцкае аб'яднанне ўкраінцаў «Краяны»), Юлія Абрамовіч (культурна-асветніцкае аб'яднанне «Саюз палякаў на Беларусі», г. Маладзечна) і іншыя.

У фае Палаца культуры адбудзецца выстаўка, дзе прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў пазнаёмяць гасцей са сваёй самабытнай культурай, з нацыянальнымі творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і літаратуры. Падчас выстаўкі-дэгустацыі можна будзе пакаштаваць стравы грэчаскай, рускай, украінскай, польскай, узбекскай, армянскай кухні, таксама пабачыць выступленне вакальнага казацкага ансамбля «Люба, браткі!» з Барысаўскага раёна.

Дадам, што з 2011 года прадугледжана намінацыя «За захаванне і пераемнасць нацыянальных традыцый сямейнай творчасці». На гэты раз яе ўдзельнікамі стануць сямейны дуэт Саарбекян (прадстаўнікі армянскай культуры з Нясвіжа) і танцавальны калектыў сям'і Саміевых са Старадарожскага раёна, якія прадстаўляюць узбекскую культуру.

Абласны фестываль праводзіцца раз у два гады. Па яго выніках журы вызначыць лаўрэатаў Х Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які пройдзе ў чэрвені наступнага года ў Гродне. Старшыня журы — Народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча, прафесар Міхаіл Дрынеўскі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■


**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**Совместное предприятие «Промекс» общество с ограниченной ответственностью информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства**

**Информация о застройщике:**

*Застройщик (Заказчик)* – СП «Промекс» ООО зарегистрировано решением Министерства внешних экономических связей Республики Беларусь № 30 от 27.02.1997 г. в Реестре общереспубликанской регистрации за № 1295, ЕГР № 100349659.

*Юридический адрес застройщика*: г. Минск, ул. Быховская, 35, помещение 12Н, комната 1.

*Почтовый адрес застройщика:* г. Минск, ул. Интернациональная, 27, тел.: (017) 328-50-51, 328-50-47, факс (017) 328-55-52.

*Режим работы*: понедельник–пятница с 9.00 до 17.00 без обеда.

Предприятие осуществляет строительство объекта собственными силами и с привлечением субподрядных организаций.

За последние три года предприятием построен Комплекс жилых домов объектами соцкультбыта и подземной автостоянкой на 25 машино-мест в квартале улиц Воронянского-Авакяна, 72-квартирный панельный дом № 14 по ул. Быховской, 190-квартирный 5-подъездный 8-, 9-, 13-, 15-этажный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами соцкультбыта и подземной автостоянкой на 207 машино-мест в квартале улиц Воронянского – Авакяна – Быховской – Радищева, завершается строительство 18-этажного односекционного жилого дома на 136 квартир в квартале улиц Воронянского – Жуковского – Быховской – Радищева.

**Информация о проекте:**

Строительство осуществляется в соответствии с условиями решения Мингорисполкома № 2670 от 25 октября 2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»

Объект долевого строительства – «Строительство многоэтажных жилых домов, не относящихся к категории повышенной комфортности, со встроенными объектами общественного назначения и сносом 1-2-этажных жилых домов в границах улиц Воронянского – Жуковского – Быховской – Радищева». 2-я очередь. Жилой дом № 6 по г/п.

Комплекс состоит из жилого дома, с размещением на 1-2 этажах встроенных помещений общественного назначения. Конструкция дома – каркасно-блочная. Наружные стены из керамзитобетоных блоков, внутренние перегородки – из керамзито-бетоных блоков и кирпичной кладки. Наружная отделка – утепление, окраска акриловой краской. Высота типовых жилых этажей – 2,7 м. Все подъезды оснащены мусоропроводом. Отделка квартир не осуществляется. Все квартиры имеют лоджии.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, тех. подполье, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство плоскостных автостоянок на 35 машино-мест.

Вышеприведенные характеристики подтверждены решением КУП «БЕЛГОСЭКСПЕРТИЗА ПО ГОРОДУ МИНСКУ» № 294-60/12 от 30.05.2012 г.

Нормативный срок строительства в соответствии с проектной документацией – 22,3 месяца.

Срок окончания строительства – IV квартал 2015 года.

Жилая часть общей площадью 13266,0 м.кв. Всего квартир 168:

Однокомнатные – максимальная площадь 47,17 м.кв., трехкомнатные – максимальная площадь 109, 83 м.кв.

Для заключения договоров долевого строительства предлагаются:

6(шесть) трехкомнатных квартир общей площадью 109,83 м.кв. и 108,57 м.кв. стоимостью 1 метра квадратного 1570 долларов США.

4(четыре) однокомнатные квартиры общей площадью 45,24 м.кв. и 47,17 м.кв. стоимостью 1 метра квадратного 1670 долларов США.

3(три) нежилых помещения стоимостью 1 метра квадратного в эквиваленте 1360 долларов США.

На предприятии действует система скидок. Возможны различные графики оплаты.

Настоящая проектная декларация действует до момента публикации следующей проектной декларации.

**Застройщиком получены:**

1. Решение Мингорисполкома № 2670 от 25 октября 2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

2. Проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке гос. экспертизу, заключение КУП «БЕЛГОСЭКСПЕРТИЗА ПО ГОРОДУ МИНСКУ» № 294-60/12 от 30.05.2012 г.

3. Разрешения на производство строительно-монтажных работ, выданного органом государственного строительного надзора № 2-204Ж-019/13 от 08.11.2013 г.

4. Свидетельства о государственной регистрации земельного участка № 500/1032-8500 от 25 ноября 2013 г. и № 500/1032-8501 от 25 ноября 2013 г.

# ПАГРОЗА ЗАСТАЕЦЦА

## МІНСК І ГОМЕЛЬ ЛІДЗІРУЮЦЬ ПА КОЛЬКАСЦІ НАРКАМАНАЎ

**На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае кіраўнік цэнтра маніторынгу за наркотыкамі і наркаспажываннем Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Уладзімір ЛЯЛЕВІЧ.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

***— Уладзімір Валяр'янавіч, як ажыццяўляецца маніторынг за наркалагічнай сітуацыяй у нашай краіне?***

— Гэтая праца распачалася 20 гадоў таму, калі па загадзе міністра аховы здароўя ўсе наркалагічныя ўстановы абавязалі раз у квартал дасылаць нам адпаведную інфармацыю. Мы распрацавалі рэгістрацыйную форму на зноў выяўленых наркаспажыўцоў, якія ставяцца на ўлік. І яшчэ адну форму — на тых, каго знімаем з уліку па прычынах смерці, выезду за межы рэспублікі, пападання ў месцы пазбаўлення волі, вылечвання па медыцынскіх параметрах. Зыходзячы з гэтых патокаў інфармацыі, мы стварылі камп'ютарны рэспубліканскі банк даных наркаспажыўцоў і абнаўляем яго да цяперашняга часу. Штогод фарміруем рэспубліканскую справаздачу ў Камітэт па кантролі за наркотыкамі ААН, які размяшчаецца ў Вене. Цесна супрацоўнічаем з органамі па наркакантролі Міністэрства ўнутраных спраў, з калегамі ў Расіі, ва Украіне і іншых краінах, удзельнічаем у міжнародных праектах.

***— ААН называе наркаманію адной з галоўных пагроз існавання нацый, нароўні з ядзернай вайной і экалагічнай катастрофай …***

— Распаўсюджанасць наркаманіі ў Беларусі, паводле нашых даных, значна ніжэй, чым, дапусцім, у Расіі і ва Украіне. Але і ў нас назіраецца тэндэнцыя да паступовага і няўхільнага росту. Напрыклад, калі ў 2008 годзе колькасць наркаспажыўцоў складала амаль 110 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, то летась — 138, а на пачатак гэтага года — ужо 155. *У цэлым па рэспубліцы на наркалагічным уліку Міністэрства аховы здароўя на 1 ліпеня гэтага года стаяла 15196 спажыўцоў псіхаактыўных рэчываў — прырост за паўгода склаў 3,7%. Пры гэтым афіцыйная інфармацыя, як лічаць многія спецыялісты ў розных краінах,— гэта толькі бачная частка айсберга.* А колькі нарказалежных рэальна — невядома, можна толькі здагадвацца. На гэты конт ёсць розныя ацэнкі. Пераважае меркаванне, што зарэгістраваную колькасць трэба памнажаць на 7–10.

***— Якая структура, спосабы спажывання наркотыкаў і іх распаўсюджанасць па рэгіёнах?***

— Традыцыйна ў нас пераважаюць спажыўцы опіумных наркотыкаў. На пачатак гэтага года колькасць опіумных наркаманаў складала 69% ад усіх зарэгістраваных. На другім месцы па спажыванні (16%) — канабіноіды (марыхуана, гашыш і інш.). Далей ідуць інгалянты — рэчывы таксіманічнага дзеяння (каля 7%) і іншыя наркотыкі.

Асноўнай асаблівасцю гэтага года з'яўляецца істотнае павелічэнне выпадкаў рэгістрацыі на наркалагічным уліку спажыўцоў курыльных сумесяў тыпу «спайс». Калі летась былі выяўлены толькі адзінкавыя выпадкі ўжывання спайсу, то сёлета наркалагічнымі ўстановамі Мінска, Гомеля і Гродна зарэгістраваны ўжо 82 спажыўцы.

Наркатычны рынак вельмі чуйна і, на жаль, іншы раз з апярэджаннем афіцыйных органаў рэагуе на гэтыя «модныя», даступныя па цане нарказмяшчальныя рэчывы. Міністэрства аховы здароўя практычна штогод аператыўна пашырае спіс наркатычных рэчываў, якія з'яўляюцца забароненымі для ўжывання. Але праўда жыцця такая, што падпольныя наркаспажыўцы працуюць даволі эфектыўна. І таму ўнясенне тых ці іншых рэчываў у спіс забароненых — гэта канстатацыя таго, што яны ўжо больш-менш працяглы час знаходзяцца на наркалагічным рынку. Аб тых жа спайсе, насваі гадоў 10 таму яшчэ ніхто не ведаў, а цяпер яны з'яўляюцца, і ўзнікаюць праблемы.

Сярод спосабаў ужывання наркатычных рэчываў, што вельмі трывожна, пераважае ін'екцыйны (на пачатак 2013 г.— 68%). Гэта пагражае найбольш сур'ёзнымі наступствамі, паколькі звязана з перадачай шэрагу захворванняў, і ў першую чаргу — з ВІЧ-інфіцыраваннем.

Сярод буйных гарадоў найбольшы паказчык распаўсюджанасці наркаманіі (на 100 тысяч насельніцтва) цяпер адзначаецца ў Мінску і Гомелі. А сярод райцэнтраў у тройцы «лідараў» Салігорск, Пінск і Светлагорск. Дарэчы, апошні яшчэ 15 гадоў таму быў у нас, умоўна кажучы, наркалагічнай «сталіцай» па колькасці спажыўцоў псіхаактыўных рэчываў.

***— А які сярэдні ўзрост нарказалежных?***

— Увогуле наркотыкі найбольш распаўсюджаны ў моладзевым асяроддзі. *Тэндэнцыі па рэзкім амалоджэнні наркаспажыўцоў у нас не прагледжваецца. Але важна мець адэкватныя праграмы, якія маглі б функцыянаваць, пачынаючы са школы.* Пэўная работа ў гэтым кірунку вядзецца, аднак яшчэ не вызначаны змест такіх праграм, аб'ём па гадзінах, узроставы перыяд, з якога трэба распачынаць прафілактычную працу. Не варта гіпертрафіраваць гэтую праблему, аднак нельга яе і замоўчваць. Трэба ўдумліва, даходліва размаўляць з маладымі людзьмі, каб яны маглі заняць разумную, актыўную пазіцыю ў дачыненні да наркотыкаў.

***— У Расіі гучалі прапановы ўвесці абавязковае тэсціраванне школьнікаў на нарказалежнасць …***

— Сапраўды, такую прапанову выказаў галоўны нарколаг Расійскай Федэрацыі Яўген Брун, які, дарэчы, быў у Гродне на адной з канферэнцый. На гэта я пакуль не магу даць адназначны адказ. Па-першае, сістэмы тэсціравання патрабуюць пэўных, і немалых, матэрыяльных затрат. Па-другое, узнікае юрыдычны аспект пытання: прымусіць быццам бы нельга, ды і ці патрэбны дазвол бацькоў?

Але пытанне тэсціравання школьнікаў на нарказалежнасць (можа, не ўсіх) павінна прапрацоўвацца. Неабходна цікавіцца адпаведным вопытам у іншых краінах, і, магчыма, адаптаваць яго да нашых рэалій.

***— Як вядома, існуе так званая замяшчальная тэрапія, калі нарказалежныя пераводзяцца з больш цяжкіх на менш небяспечныя па наступствах для здароўя наркотыкі. І разам з тым — сілавыя меры па ўзмацненні барацьбы з наркаспажываннем. Дзе ў гэтай сферы разумны баланс?***

— Тут некалькі аспектаў. Першы звязаны з тым, што наркотыкі — гэта забаронены субстрат, які нельга афіцыйна перавозіць і распаўсюджваць. Таму праца розных ведамстваў, і ў першую чаргу праваахоўных органаў, у гэтым кірунку павінна праводзіцца няўхільна. Гэта датычыцца і барацьбы з нелегальнымі каналамі паставак наркотыкаў у Беларусь з-за мяжы, транзітных перавозак, і процідзеяння наркавытворчасці ўнутры рэспублікі, і кантролю за абаротам наркатычных рэчываў, што выкарыстоўваюцца ў медыцынскай практыцы. Ніякіх паслабленняў тут быць не павінна, у тым ліку і па мерах крымінальнай адказнасці. Дарэчы, некалькі гадоў таму нашым заканадаўствам быў павялічаны тэрмін пакарання за распаўсюджванне наркотыкаў.

Што ж датычыцца лячэння наркаманіі, то гэтая справа вельмі складаная, неадназначная. Эфектыўнасць медыцынскай дапамогі не толькі ў нас, але і за мяжой далёкая ад жаданай. Часцей за ўсё лячэнне абмяжоўваецца купіраваннем вострых праяў (на мове наркаманаў — «ломкі»), а вось далейшая работа з гэтымі пацыентамі — праблема. Як правіла, пасля часовай нармалізацыі стану яны адмаўляюцца ад далейшай рэабілітацыі ў стацыянары і па гэтай прычыне выпісваюцца з рэкамендацыяй прадоўжыць лячыцца ў амбулаторных умовах. Аднак такое лячэнне праходзіць невялікая частка людзей з залежнасцю.

Адзін з метадаў дапамогі такім асобам — гэта так званая замяшчальная тэрапія, якая цяпер прымяняецца ў шэрагу краін. Адпаведная «метадонавая праграма» ў апошнія гады працуе і ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі. Сэнс заключаецца ў тым, каб вывесці наркаспажыўцоў з падпольнага рынку наркотыкаў, перавёўшы іх на ўжыванне метадону ў спецыялізаваных кабінетах наркалагічных устаноў пад наглядам урача. На жаль, не ўсе пацыенты выконваюць патрабаванні гэтай праграмы, але работа ў гэтым кірунку павінна працягвацца.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



# ГЕАПАЛІТЫКА... ЗАЛЕЖНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Можна было б сказаць, што не варта звяртаць увагу на экстравагантныя заявы адстаўных палітыкаў і што ў калідорах ААН ёсць шмат розных «дакладаў». Дарэчы, у структурах самой ААН — упраўленні па наркотыках і злачыннасці і Міжнародным камітэце па кантролі за наркотыкамі — гэты даклад выклікаў толькі абурэнне. Але тут у дакладчыках не шэраговыя адстаўныя палітыкі, а людзі, якія ўваходзяць у сусветную эліту, у тым ліку былы генсакратар ААН Кофі Анан, у мінулым генеральны сакратар НАТА Хаўер Салана і іншыя. Гэтыя людзі ніколі не кажуць нешта бессэнсоўнае, а заўсёды маюць пэўныя мэты.

Не выключана, што гэты дэмарш — замова паўднёваамерыканскіх наркакартэляў для атрымання яшчэ больш вялікіх прыбыткаў. Антынаркатычная барацьба — адзін з традыцыйных элементаў знешняй палітыкі ЗША ва ўзаемаадносінах з лацінаамерыканскімі краінамі. Вашынгтон так вырашае свае праблемы, у тым ліку замену кіраўнікоў суседніх краін.

Частковая легалізацыя наркотыкаў і зніжэнне градуса антынаркатычнай барацьбы могуць дапамагчы ЗША пераключыцца на іншыя праблемы. У прыватнасці, на вывад войскаў з Афганістана, дзе наркотыкі таксама адзін з галоўных фактараў палітыкі.

Сама ж прапанова легалізацыі лёгкіх наркотыкаў — амаральная. Напрыклад, пасля легалізацыі марыхуаны ў Галандыі колькасць яе спажыўцоў адразу падскочыла ў некалькі разоў. «Лёгкія наркотыкі» — гэта хуткі шлях да «цяжкіх». Навукоўцы Калумбійскага ўніверсітэта (ЗША) высветлілі, што ўжыванне марыхуаны павышае шанцы пераходу на цяжкія наркотыкі для дзяцей у 85 разоў, для дарослых — у 17.

Расійская сітуацыя з наркотыкамі катастрафічная. Сёння ў краіне, па розных ацэнках, да 8.500.000 спажыўцоў наркотыкаў. Пайсці на легалізацыю ў любым выглядзе — гэта выклікаць калапс. Расіі патрэбна не легалізацыя наркотыкаў, а суровая крымінальная адказнасць за іх прапаганду і заклікі да легалізацыі.

Але ж сапраўды прыйшоў час новых падыходаў у барацьбе з наркамафіяй на міжнародным узроўні. Так, відавочна, што сусветная супольнасць прагледзела маштаб праблемы афганскага наркатрафіку. Таму, напрыклад, выпрацоўка дзяржавамі — членамі ШАС абагульненай пазіцыі, накіраванай на кваліфікацыю афганскай наркавытворчасці як прамой пагрозы міжнароднаму міру і бяспецы, мела б гістарычнае значэнне. Такая пазіцыя ўжо была заяўлена з боку АДКБ, што стала вынікам беларускай ініцыятывы. У рэчышчы гэтых новых падыходаў напярэдадні 2015 года мы прапануем сіламі Генасамблеі ўсклассці на Эканамічны і Сацыяльны Савет ААН новую функцыю альтэрнатыўнага фарсіраванага развіцця Афганістана.

**— Як палітычныя падзеі ў Цэнтральнай Азіі (пасля выхаду часткі войскаў НАТА з Афганістана) і Лацінскай Амерыцы (цяперашняя палітычная дэстабілізацыя Бразіліі, Чылі) адаб'юцца на стратэгіі наркамафіі?**

— Ёсць два глабальныя цэнтры вытворчасці наркотыкаў у прамысловых маштабах. Гэта Калумбія, Перу, Балівія і Афганістан. Калі ў Паўднёвай Амерыцы лакалізавана вытворчасць 100% какаіну ў свеце, то ў Афганістане — 90–95% усёй сусветнай вытворчасці гераіну.

Афганская наркавытворчасць — гэта генератар усяго спектру пагроз, сістэмаўтваральны фактар ваенна-палітычнай сітуацыі Еўразіі. Аналіз паказвае, што вывад асноўнай часткі замежных войскаў з Афганістана і зняцце ў 2014 годзе адказнасці міжнароднай супольнасці за бяспеку ў гэтай дзяржаве не ў стане змяніць катастрафічную сітуацыю з наркавытворчасцю.

Таму трэба ставіць пытанне не пра далейшае стрымліванне трафіку наркотыкаў, а пра кардынальнае — сапраўды рэвалюцыйнае — зніжэнне наркавытворчасці ў Афганістане як мінімум у 10 разоў. Гэта гістарычная задача кіраўніцтва нашых краін і ўсёй сусветнай супольнасці.

Прычына росту рынку збыту какаіну ў Еўропе — гэта пераразмеркаванне аб'ёмаў яго вытворчасці ў Паўднёвай Амерыцы за апошнія пяць гадоў. Што адбылося? У Калумбіі з дапамогай авіяцыі сталі больш інтэнсіўна знішчаць палі кустоў кокі. Вытворчасць кокі наркамафія перанесла ў суседнія краіны — Балівію і Перу. Традыцыйных наркамаршрутаў на поўнач з гэтых краін у бок Мексікі, Канады і ЗША пакуль не было. І трафік пайшоў праз Бразілію і Аргенціну. Там перахопліваюць і спажываюць сумарна каля 30 з 300 тон наркотыку. 270 тон ідзе цераз Атлантычны акіян, ва Усходнюю Афрыку. Адтуль какаін накіроўваецца ў Еўропу. Рынак збыту там павялічыўся ў пяць разоў.

Штогадовы абарот наркагрошай складае каля 800 мільярдаў долараў, што супастаўна са ступенню ўплыву на сусветную эканоміку нафты і газу. Наркатрафік — донар дэфіцытнай ліквіднасці сусветнай банкаўскай сістэмы. Па сутнасці, з'яўляецца крытычна неабходным, неад'емным сегментам усёй цяперашняй манетарнай сістэмы, што разганяе глабальны фінансава-эканамічны крызіс. Апошні, у сваю чаргу, выступае свайго роду драйверам для фінансава-эканамічнага і сацыяльнага заказу на працяг наркавытворчасці.

**— Як вы ацэньваеце наркасітуацыю ў заходняй частцы постсавецкай прасторы, у тым ліку ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі? Ці атрымалася ў беларускіх і расійскіх праваахоўных органаў дамагчыся дастатковага ўзроўню ўзаемадзеяння ў барацьбе з наркапагрозай?**

— Беларуска-літоўскі ўчастак мяжы буйных транзітных транспартных магістраляў выкарыстоўваецца арганізатарамі міжнароднага наркатрафіку для паставак наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў з краін ЕС у Расію, а таксама з Цэнтральнай Азіі ў ЕС. У 2012 годзе праз пункты пропуску літоўскага ўчастка спрабавалі завезці ў Беларусь як сінтэтычныя псіхатропныя рэчывы, так і наркотыкі расліннага паходжання. Па-ранейшаму злачынцы робяць спробы стварэння на тэрыторыі Беларусі падпольных лабараторый па вытворчасці наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Прычым іх колькасць штогод павялічваецца.



Пагадненне паміж ФСКН Расіі і МУС Рэспублікі Беларусь аб супрацоўніцтве ў барацьбе з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў дзейнічаюць з мая 2005 года. За гэты час узаемадзеянне расійскіх і беларускіх калег дасягнула вельмі высокага прафесійнага ўзроўню.

Паміж нашымі службамі на пастаяннай аснове ажыццяўляецца актыўны абмен аператыўнай інфармацыяй. Праваахоўныя органы Беларусі — актыўныя ўдзельнікі спецыяльных лакальных антынаркатычных аперацый «Канал». Яны праводзяцца на падставе прынятага ў 2008 г. рашэння Савета калектыўнай бяспекі Дагавора дзяржаў — членаў АДКБ. Падчас адной з апошніх аперацый праца Аператыўнага ўпраўлення Міжнароднага каардынацыйнага штаба па кіраўніцтве аперацыяй была разгорнута на базе МУС Рэспублікі Беларусь.

Дзякуючы дакладнай і зладжанай рабоце нацыянальных міжведамасных штабоў дзяржаў — членаў АДКБ, праваахоўных органаў дзяржаў — назіральнікаў, высокай ступені даверу паміж удзельнікамі і іх актыўнага ўзаемадзеяння з незаконнага абароту канфіскавана каля 3 тон наркотыкаў — у тым ліку 17 кілаграмаў гераіну, больш за 3 кілаграмы сінтэтычных наркотыкаў, адзін кілаграм опію, амаль 2,8 тоны марыхуаны, 2 кілаграмы гашышу, 111 грамаў какаіну, 8 тон дзікарослага маку, а таксама больш за 38 кілаграмаў прэкурсораў.

Станоўчы вопыт правядзення лакальных антынаркатычных аперацый даказвае эфектыўнасць міжнароднага інструмента барацьбы з незаконным абаротам наркотыкаў і неабходнасць працягу актыўнай дзейнасці па развіцці ўзаемавыгаднага ўзаемадзеяння на субрэгіянальным узроўні.

**— У Беларусі і Расіі рэалізуюцца прынцыпова розныя падыходы да рэабілітацыі нарказалежных. Перш за ўсё, гаворка ідзе пра стаўленне да замяшчальнай тэрапіі. Ці не ўяўляе такое адрозненне падыходаў перашкоды на шляху да больш эфектыўнага супрацоўніцтва?**

— У нас няма перашкод для эфектыўнага супрацоўніцтва. Неабходна адзначыць, што ў 2012 годзе ў Рэспубліцы Беларусь быў прыняты Закон «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах, іх прэкурсорах і аналагах», у якім, аналагічна адпаведнаму нашаму федэральнаму закону, асобныя часткі прысвечаны як незаконнаму абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў, так і прафілактыцы іх спажывання. Прычым вылучаюцца асобы, якія спажываюць наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы, іх прэкурсоры і аналагі, і асобы, хворыя на наркаманію.

Што тычыцца замяшчальнай тэрапіі, то яна практыкуецца ў шэрагу краін былога СССР. Наркаману пад наглядам даюць метадон, паступова памяншаючы дозы, і, як сцвярджаюць, залежнасць зніжаецца. Але няма клінічна пацверджаных даных, што гэта прыносіць эфект. Ёсць зваротныя вынікі: чалавек атрымлівае залежнасць менавіта ад метадону і не можа пазбавіцца ад яе.

Да прыкладу, ва Украіне, дзе практыкуюць замяшчальную тэрапію, цяпер кажуць, што страшнай праблемай стаў метадон. Спачатку лічылі, што метадон — панацэя. Але потым рэзка пайшла ўгару смяротнасць, а колькасць спажыўцоў стала хутка расці, метадон пачаў «круціцца» на чорным рынку. Залежнасць ад яго яшчэ больш моцная, чым ад гераіну. Каб зняць гераінавую абстыненцыю, трэба 14 дзён, а метадонавую — 45 сутак.

Метадонавыя праграмы ўкараняюцца за гранты ад розных няўрадавых арганізацый з-за мяжы. Таму здаецца, што лячэнне бясплатнае. Але калі людзі прывыкаюць да гэтага наркотыку, патрэбны велізарныя сродкі, каб закупляць яго для распаўсюджвання сярод насельніцтва.

**Таму абарот метадону, як сінтэтычнага лекавага прэпарата з групы апіоідаў, які ўжываецца як анальгетык пры лячэнні наркатычнай залежнасці, у Расіі катэгарычна забаронены.**

Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце www.zviazda.by

**Падрыхтаваў Юрый ЦАРЫК.**

# «ЛЮДЗІ ГНІЛІ, БО КАРЫСТАЛІСЯ НЕСТЭРЫЛЬНЫМІ ШПРЫЦАМІ»

**Палкоўнік Юрый Маркевіч узначальвае ўпраўленне па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама і як ніхто іншы разумее, што такое наркаманія і як з ёй змагацца. Ён добра ведае пра ўсё, што адбывалася ў Светлагорску ў 90-я гады мінулага стагоддзя.**



## Выжылі тыя, каго пасадзілі

«Горад без будучыні» — так называлі Светлагорск у СМІ — праз дзесяцігоддзе стаў рэальным прыкладам, можа, і не абсалютнай, але ж перамогі дабра над злом. І заслуга ў гэтым не толькі праваахоўнікаў, лічыць Юрый Сяргеевіч:

— Масавая наркаманія ў Светлагорску пачалася пасля таго, як у канцы 80-х у горад вярнуліся два мясцовыя жыхары, якіх у Ленінградзе выключылі з інстытута за ўжыванне наркотыкаў. А ўжо ў пачатку 90-х усё насельніцтва Светлагорска на свае вочы пабачыла небяспеку наркаманіі. Літаральна ў кожнага быў ці то сусед-наркаман, ці то сваяк-наркаман, ці то знаёмы-наркаман… Маладыя паміралі ад перадазіроўкі. Людзі гнілі, бо выкарыстоўвалі нестэрыльныя шпрыцы. Сталі распаўсюджвацца гепатыт і СНІД. Дзесяць гадоў спатрэбілася, каб узяць сітуацыю пад кантроль. З наркаманіяй усе сталі змагацца адкрыта: праваахоўнікі, улады, установы адукацыі, аховы здароўя, СМІ… А самае галоўнае — людзі тэлефанавалі ў міліцыю штодзень па 10–15 разоў з паведамленнямі аб тым, дзе сабраліся наркаманы, дзе вырабляюць наркотыкі… Міліцыя адразу ж рэагавала. За злачынствы, звязаныя з наркотыкамі, арыштоўвалі, утрымлівалі пад вартай, а суд пазбаўляў волі… Трэба было збіць хвалю, ізаляваць наркаманаў ад грамадства і адначасова не дапусціць прытоку моладзі. Між іншым, потым многія казалі: «Дзякуй, што вы мяне тады пасадзілі ў турму, бо толькі там я змог асэнсаваць сваю праблему і пачаць з ёю змагацца».

Сярод моладзі Светлагорска ў той час існавала пэўная мода на ўжыванне наркотыкаў. Нават тыя, хто не зведаў забароненага зелля, пераймалі некаторыя звычкі наркаманаў. Напрыклад, на дыскатэку ўсе прыходзілі з бутэлькай вады падпахай. Наркаманы — каб наталяць смагу, іншыя — каб не выдзяляцца.

Правільна было зроблена, лічыць Юрый Сяргеевіч, што не затойвалі, не замоўчвалі існаванне гэтай праблемы. Можа, таму зараз у Светлагорску колькасць наркаманаў, якія стаяць на ўліку, набліжаецца да рэальнай — у іншых гарадах іх значна больш, чым выяўленых афіцыйна. Цяпер аператыўная абстаноўка ў вялікім прамысловым цэнтры на поўначы Гомельшчыны практычна не адрозніваецца ад іншых буйных рэгіёнаў вобласці.

## Што не забаронена — тое дазволена?

Праваахоўнікаў вельмі хвалюе, што апошнім часам набіраюць папулярнасць курыльныя сумесі — так званы «спайс». Праблема ў тым, што спайс актыўна рэкламуюць, бо пакуль ён не трапіў у спіс забароненых рэчываў.

— Курыльныя сумесі сёння практычна выцеснілі ўсе іншыя наркотыкі,— адзначае Юрый Маркевіч.— Частка так званага «спайсу» пастаўляецца ў краіну легальна. Мы не можам прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за дзеянні з ім. Штогод спісы забароненых рэчываў дапаўняюцца новымі назвамі, і штогод з'яўляюцца новыя віды псіхатропных рэчываў. Калі ў поле нашай ўвагі трапляюць людзі, якія распаўсюджваюць зелле, мы праводзім стандартныя аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы. Затрымліваем грамадзяніна, праводзім экспертызу рэчыва, і часта яна сведчыць, што рэчыва афіцыйна не з'яўляецца наркотыкам. Мы ж можам прыцягнуць да адказнасці толькі за тое, што забаронена. І тады праваахоўныя органы ініцыіруюць даследаванне гэтага новага рэчыва, каб ва ўстаноўленым парадку яно было ўнесена ў адпаведныя спісы. Працэдура займае 3–4 месяцы, на працягу якіх наркотык свабодна гуляе па краіне. Між тым, уздзеянне ад спажывання спайсу — сінтэтычнай марыхуаны — у шмат разоў пераўзыходзіць уздзеянне звычайнай марыхуаны. Але ж моладзь заўсёды хоча паспрабаваць нешта новае, тым больш афіцыйна не забароненае.

**Сярод моладзі Светлагорска існавала пэўная мода на ўжыванне наркотыкаў. Нават тыя, хто не зведаў забароненага зелля, пераймалі некаторыя звычкі наркаманаў.**

## Гора макавае

Ёсць і іншая праблема, на вырашэнне якой складана істотна паўплываць. Размова пра насенне маку. Калі 20 гадоў таму экстракцыйны опій гатаваўся з макавай саломкі, сёння аматары навучыліся вырабляць яго і з насення неачышчанага маку. Пры гэтым афіцыйна такі мак — не ў спісе забароненых рэчываў. І гэта прабел у заканадаўстве, які, спадзяецца Юрый Сяргеевіч, хутка будзе ліквідаваны:

— Мы ж можам дзейнічаць толькі ў межах закона. Затрымліваем распаўсюджвальніка насення маку, але ж прыцягваем яго толькі да адміністрацыйнай адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Ён плаціць у падатковай інспекцыі штраф і… узнімае цану на мак, каб пакрыць свае расходы. Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект па кантролі за рэалізацыяй насення маку. Я лічу, што дзяржава павінна ўзяць пад поўны кантроль гэтую рэалізацыю. Бо сітуацыя, якая існуе, наносіць шкоду ў тым ліку іміджу ўлады: звычайны грамадзянін лічыць, што міліцыя не працуе.

Сёння насенне неачышчанага маку афіцыйна завозіцца на тэрыторыю Беларусі з Украіны, Чэхіі… Між тым, зараз цана за 1 кг у Гомелі даходзіць да Br1 млн. Менавіта таму прадаўцы маку ніколі проста так не адмовяцца ад сваёй дзейнасці, ведаючы, што вялікай адказнасці не панясуць.

## Хімікі і батанікі

Каналы, па якіх прыходзіць да нас атрута, таксама пастаянна адсочваюцца. Спайсы наркаспажыўцы замаўляюць часцей за ўсё праз інтэрнэт — з Кітая. Марыхуана, якая яшчэ 5–8 гадоў таму завозілася з Сярэдняй Азіі або Галандыі, зараз выспявае да неабходнай кандыцыі і ў нас — бо істотна змяніліся кліматычныя ўмовы. Дарэчы, сёлета на Гомельшчыне было знішчана больш за 55 тон гэтай дзікарослай наркасыравіны. Адначасова міліцыянеры па-ранейшаму сутыкаюцца з «батанікамі», якія, нягледзячы на забароны, вырошчваюць каноплі — ці на агародах, ці дома. Сёлета да адміністрацыйнай адказнасці за незаконнае вырошчванне нарказмяшчальных раслін на Гомельшчыне быў прыцягнуты 201 чалавек.

**Уздзеянне ад спажывання спайсу — сінтэтычнай марыхуаны — у шмат разоў пераўзыходзіць уздзеянне звычайнай марыхуаны. Але ж моладзь заўсёды хоча паспрабаваць нешта новае, тым больш афіцыйна не забароненае.**

— Гераіну стала менш,— адзначае Юрый Маркевіч.— Ён вырабляецца ў Афганістане і праз тэрыторыю Расіі трапляе да нас. Два каналы паступлення амфетаміну з Санкт-Пецярбурга сёлета намі былі перакрыты. На тэрыторыі Гомельшчыны ў гэтым годзе выяўлены і знішчаны 3 наркалабараторыі. Калі вы думаеце, што іх трымалі нейкія спецыялісты ў галіне хіміі,— памыляецеся. Сёння ў інтэрнэце можна знайсці і рэцэпты, і адрас, дзе можна купіць кампаненты, і адпаведнае абсталяванне…

Сёлета ў маланаселенай вёсцы аднаго з чарнобыльскіх раёнаў міліцыянеры знайшлі больш за 10 кілаграмаў марыхуаны, якая захоўвалася ў трох мяшках. Мяшкі — у скрынях, а скрыні — у яміне, вырытай у адрыне і засыпанай сенам. Раслінная атрута, якой хапіла б на 40 тысяч доз, была канфіскавана. Гэта стала магчымым пасля затрымання некалькіх збытчыкаў у Гомелі.

## Увага: дзеці!

— Хаця мае падраздзяленне аператыўнае (мы выяўляем злачынствы, збытчыкаў, перакрываем каналы, дзейнасць падпольных наркалабараторый), але ж наша работа не будзе дасканалай без адпаведнай прафілактыкі,— лічыць Юрый Маркевіч.— Таму мы падрыхтавалі метадычныя рэкамендацыі «Бацькам аб наркаманіі: як абараніць дзяцей». Знялі відэафільмы аб паламаных лёсах людзей. Калі раней наркотыкі былі праблемай нестабільных сем'яў, зараз гэта не так. Толькі адзін прыклад. За месяц, пакуль бацькі адпачывалі, сын спустошыў кватэру. Высветлілася, што за гэты непрацяглы час падлетку далі паспрабаваць наркотык, а потым растлумачылі, што ён каштуе грошай. У яго вельмі хутка сфарміравалася залежнасць, і ён прадаў усё, толькі каб атрымаць зелле. Бацькі ўпэўнены, што дзяцей трэба накарміць, апрануць — і ўсё. А што ў дзіцяці ў галаве, у душы і сэрцы — нікога не хвалюе. Дзеці, якія належаць самі сабе, трапляюць у групу рызыкі. Сённяшняе грамадства спажывання спрыяе таму, каб у чалавека пастаянна ўзнікала жаданне паспрабаваць нешта новае. На пытанне: «А чаго яшчэ я ў жыцці не спрабаваў?» у некаторых адказ адзін: «Толькі наркотыкі». Патрэбна, каб людзі мелі не толькі матэрыяльныя каштоўнасці.

Да крымінальнай адказнасці па лініі наркакантролю сёлета прыцягнута каля 300 чалавек. З іх 23 — навучэнцы сярэдніх і студэнты вышэйшых навучальных устаноў і 13 — непаўналетнія. Між тым, праведзеныя сярод моладзі даследаванні сведчаць аб тым, што больш за 40% пра наркотыкі даведаліся са СМІ — як пра нешта станоўчае. 3% спажывалі іх хаця б раз у жыцці. Юрый Сяргеевіч упэўнены: калі ў вашага сына ці дачкі з'явіўся сябар-наркаман, трэба любым чынам абараніць дзіця ад стасункаў з ім. Бо наркаман у пэўны момант абавязкова прапануе наркотык сябру:

— Я за тое, каб абмежаваць прысутнасць нават намёкаў на ўжыванне наркотыкаў. Часам на рэкламе чагосьці бясшкоднага ў кутку намалявана галінка канопляў. Распаўсюджаны капялюшыкі з выявай ліста канопляў. Гэта ж утоеная рэклама наркотыкаў. Неабходны закон пра забарону нават такой ускоснай рэкламы смяротнай атруты.

## Метадон — не выратаванне

У Светлагорску некалькі гадоў працуе так званая замяняльная «метадонавая праграма». Сутнасць яе ў легальным прадастаўленні наркотыку тым, хто пакутуе на наркazалежнасць. На базе наркалагічнага дыспансера адкрыты кабінет, дзе афіцыйна зарэгістраваныя наркаманы атрымліваюць сваю штодзённую «дозу». Гэта вымушаная мера, лічаць некаторыя спецыялісты, якая, аднак, дазваляе трымаць сітуацыю з ужываннем наркотыкаў заўзятымі прыхільнікамі гэтага зелля пад некаторым кантролем. Такім чынам наркаман выключаецца з крымінальнага асяроддзя, не шукае прыгод для сябе і не стварае для сваякоў сацыяльнага напружання. Тым не менш Юрый Маркевіч лічыць, што метадонавая праграма з'яўляецца толькі легалізацыяй наркаманіі:

— Магчыма, ад такой праграмы ёсць нейкія плюсы, але ж, на мой погляд, мінусаў больш. Адзін наркаман афіцыйна атрымлівае сваю «дозу», а іншы, не зарэгістраваны, будзе затрыманы з наркотыкам і прыцягнуты да адказнасці. Да таго ж не кожны наркаман спажывае наркотык штодзень, а ў гэтай легальнай сітуацыі ён абавязкова прыйдзе. Вельмі сумнiўна, што пасля спажывання метадону многія з іх уладкуюцца на працу… Пытанняў больш, чым адказаў. Я лічу, што павінна быць сістэма прафілактыкі, прававое ўздзеянне, лячэнне і рэабілітацыя. Ёсць прыклады, калі былыя наркаманы свядома адмаўляліся ад ужывання зелля. Нядрэнныя вынікі ў рэабілітацыйных цэнтраў, якія працуюць з наркаманамі на тэрыторыі Гомельшчыны. У іх часцей за ўсё былыя наркаманы дапамагаюць нарказалежным. На сваім прыкладзе падказваюць, як можна пазбавіцца ад залежнасці. За год-паўтара пры моцным жаданні людзей атрымліваецца адцягнуць ад наркотыкаў…

**Сёння галоўная задача — не дапусціць, каб наркотыкі зноў сталі моднымі, бо такая «мода» заўсёды знойдзе сваіх ахвяр. З праблемай спраўляцца можна, але ж толькі ўсім разам.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

■ Я зноў пішу

## ЧАС — НОВЫ. А КАШТОЎНАСЦІ — ВЕЧНЫЯ

**Найперш хачу выказаць сваю ўдзячнасць газеце «Звязда», бо з вашай дапамогай усё ж адрамантавалі абеліск, што стаіць на рагу вуліц Маякоўскага-Аранжарэйная, і цяпер многім неабыякавым можна будзе спакайней сустракаць 70-годдзе вызвалення нашай краіны ад фашысцкай навалы. Спадзяюся, што і я дажыву да гэтага часу і салдацкімі 100 грамамі памяну ўсіх загінулых патрыётаў мінскага падполля, усіх ахвяр мінулай вайны.**

Асобны дзякуй газеце яшчэ і за тое, што падтрымала жаданне амаль тысячы чытачоў адстаяць бібліятэку па вул. Рыбалкі. Яе хацелі закрыць. А куды ж тады людзям, аматарам кнігі — асабліва сталага ўзросту?

Зразумела, што цяпер іншы час, бібліятэкам патрэбны не толькі новыя кнігі — патрэбны сустрэчы з пісьменнікамі, жывыя зносіны... А таму, на мой погляд, рана «хаваць» друкаванае слова — і кніжнае, і газетнае! Яно было спачатку, яно ёсць. І яно будзе!

**Уладзімір ГОЛУБЕЎ, г. Мінск.**

■ Афіцыйна

## «МЫ ПРЫВЫКЛІ ДА ТАГО, ШТО Ў НАС ЧЫСЦІНЯ І ПАРАДАК»

**Пад такім загалоўкам у нумары «Звязды» за 26 кастрычніка быў надрукаваны ліст мінчанкі А. Глінскай. У ім распавядалася аб тым, як жыхары мікрараёна Серабранка чакалі будаўніцтва падземнага перахода на скрыжаванні галоўных вуліц, як дачакаліся... І як засмуціліся праз месяц-другі, убачыўшы, што ў навабудоўлі ніхто не прыбірае, а сцены — спрэс у «роспісах» невядомых «мастакоў»...**

Як паведаміў у адказ на публікацыю кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна г. Мінска В.І. Кулеш, вышэйзгаданы падземны пешаходны пераход узводзіўся ў складзе аб'екта «Будаўніцтва трамвайнай лініі ў мікрараёне Серабранка на ўчастку ад вул. Пляханава да вул. Якубава». Заказчыкам аб'екта выступала дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс». Пасля завяршэння будаўнічых работ усе заўвагі эксплуатуючых арганізацый па падземным пешаходным пераходзе былі ліквідаваны заказчыкам і генпадрадчыкам.

«Да ўводу аб'екта ў эксплуатацыю і перадачы на баланс эксплуатуючым арганізацыям падземны пешаходны пераход у сувязі з неабходнасцю забеспячэння бяспекі людзей быў адкрыты. Яго належны санітарны і тэхнічны стан павінен быў забяспечвацца сіламі заказчыка.

Акт прыёмкі ў эксплуатацыю аб'екта падпісаны і зацверджаны загадам ДП «Мінсктранс» ад 31.10.2013 № 756.

Рашэннем Мінгарвыканкама ад 01.11.2013 № 2771 падземны пешаходны пераход замацаваны за ўнітарным прадпрыемствам «Гараўтамост», якім цяпер забяспечваецца выкананне ўсяго комплексу работ, звязаных з эксплуатацыяй, абслугоўваннем, а таксама захаванасцю падземнага пешаходнага перахода».

■ Пасля пісьма

## З ВЯЛІКАГА ГРОМУ...

**Жыццё ёсць жыццё, і просьбы аб дапамозе ў рэдакцыйнай пошце, вядома ж, не рэдкасць. Гэты, чарговы, ліст быў досыць кароткі па змесце. І такі ж трывожны. «Мне 57 гадоў, і ўжо сем з іх я нідзе не працую, — пісаў спадар С. — Жыву ў вёсцы, даглядаю састарэлую маці. Ёй 92 гады і яна мяне «корміць», бо мне аніякай пенсіі не плацяць... Кватэра, у якой пражываем, патрабуе рамонту. Ведаюць пра гэта і пажарнікі, і старшыня пасялковага Савета, і работнікі сацыяльнай службы, але ніхто нічога не робіць»...**

З разлікам на аператыўны разгляд рэдакцыя накіравала гэты ліст (адрасаваны, дарэчы, яшчэ і ў Палату прадстаўнікоў) у райвыканкам па месцы жыхарства заяўніка. Адказу доўга чакаць не давялося. Аднак сказаць, што ён проста збянтэжыў, відавочна, мала, бо ў ім, афіцыйным, паведамлялася...

Паведамлялася найперш, што зварот сп. С. разгледжаны, што аўтар яго 1956 года нараджэння зарэгістраваны і пастаянна пражывае ў вёсцы... Гэта сапраўды так, а вось усё астатняе...

Падчас абследавання (адказ друкуецца ў вельмі блізкім пераказе з неабходнымі, як падалося, скарачэннямі. — **Рэд**.) было ўстаноўлена, што С. пражывае... адзін, што дом у 1980 годзе быў выдзелены яго маці, што сама яна з 2005 года жыве ў дачкі ў горадзе...

А далей болей, як той казаў: дом, у якім жыве заяўнік, знаходзіцца на балансе філіяла адкрытага акцыянернага таварыства і, паводле адказу, «па аказанне дапамогі ў рамонце заяўнік не звяртаўся».

Аднак і на гэтым неспадзяванкі не скончыліся. Згодна з адказам з райвыканкама, спадар С. рашэннем праўлення сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва яшчэ ў 2006 годзе быў звольнены з працы за прагулы і цяпер нідзе не працуе, злоўжывае спіртным...

Дадаткова паведамлялася, што 07.10.2013 года заяўнік быў пісьмова запрошаны ў аддзел дзяржаўнай службы занятасці для аказання садзейнічання ў працаўладкаванні, аднак туды так і не з'явіўся.

...Што дадаць да гэтай перапіскі, апроч кароткага «Без каментарыяў»? Хіба яшчэ адну цытату з афіцыйнага адказу: «У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь тэрытарыяльнымі органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аказваецца садзейнічанне грамадзянам у пошуку падыходзячай працы і працаўладкаванні непасрэдна пры іх асабістым звароце. У сувязі з гэтым для атрымання садзейнічання ў пошуку падыходзячай працы С. паўторна рэкамендавана звярнуцца ў аддзел дзяржаўнай службы занятасці».

Значыць, шанц у чалавека застаецца. А вось скарыстаецца ён ім ці не...

Яго выбар. Менавіта з гэтай прычыны мы не называем прозвішча і зваротны адрас.

Да таго ж у чалавека ёсць маці...

■ Зачапіла

## «З НАШАЙ ВЯЛІКАЙ СЯМ'І ЗАСТАЛІСЯ ТОЛЬКІ МАМА І Я»

**У газеце «Звязда» ад 22 кастрычніка надрукаваны артыкул Аляксандра Пукшанскага «За што Жукава павmember жалі партызаны?». У ім узгадваецца, як узялі ў палон нямецкага обер-лейтэнанта.**

Гэты эпізод мне добра вядомы, бо здзейснілі гэта дзве маладзенькія дзяўчыны — мая старэйшая сястра Вольга Шматкова і масквічка Дора. Яны сябравалі з маёй сястрой, разам хадзілі на заданні... За гэты сапраўды гераічны ўчынак абедзве былі прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Леніна. Але атрымаць яго не паспелі: 19 мая 1943 года супраць партызан была праведзена карная аперацыя і атрада не стала.

У гібелі яго ёсць шмат незразумелага. Прыкладна за месяц да гэтай сумнай даты ў атрад па чыімсьці загадзе прынялі групу былых уласаўцаў. Я іх сама бачыла: добра апранутыя, адкормленыя, узброеныя. Магчыма, гэта яны дапамаглі немцам знішчыць атрад, бо не было іх сярод загінулых. І магчыма, з гэтай прычыны ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі ў раздзеле «Партызанскі рух на Беларусі» наш атрад, якім камандаваў масквіч Васіль Сраднякоў з брыгады Біруліна, нават не ўпамінаецца?

У мяне просьба да журналіста Пукшанскага — прадоўжыць пачатую справу. Недзе ж павінны быць архіўныя дакументы, якія змаглі б праліць святло, устанавіць ісціну...

А зараз крыху пра сябе.

Нашу вёску Талынава, што ў Віцебскім раёне, немцы і паліцаі спалілі летам 1942 г., людзей не знішчылі — іх выратавалі партызаны. А далей — лес, зямлянка... Падчас карнай аперацыі 19 мая ўсіх мірных жыхароў, каго змаглі вылавіць у лесе, сагналі ў млын і падпалілі. Мы выратаваліся, некаторы час жылі ў лесе. Аднак хутка мая другая сястра Надзея захварэла на брушны тыф.

Нас прытуліла ў сябе старэнькая фінка. Фіны жылі ў нашай мясцовасці, немцы іх не чапалі. І сястру фінка вылечыла.

У канцы лістапада зноў прыйшлі немцы, нас забралі, завезлі ў Віцебск, пагрузілі ў таварныя вагоны і павезлі на захад. Вазілі туды і назад некалькі дзён. Мы былі прыкрыццем: на захад вывозілі нарабаванае, на ўсход — сваіх салдат. Калі наляталі савецкія самалёты, цягнік спынялі, нас выганялі з вагонаў, каб самалёты не бамбілі: эшалон, маўляў, з мірнымі жыхарамі...

Выгрузілі нас у г. Алітусе, дзе быў лагер часовага ўтрымання, і найперш загналі ў халодную лазню, усіх прымусілі распрануцца і выліць на сябе вядро ледзяной вады. Затым нас адправілі ў барак, таксама халодны, абнесены калючым дротам. На вышках дзяжурылі назіральнікі з аўтаматамі і сабакамі.

Трымалі нас, аж пакуль не памерлі ўсе, хто захварэў. Жывых падзялілі на дзве групы: больш моцных адправілі ў Германію, слабейшых, такіх як мы, прадалі на зіму літоўцам, а вясной зноў вярнулі назад. Мама і сястра Надзея працавалі ў полі, вырошчвалі кок-сагыз, брат даглядаў коней, я заставалася ў бараку.

Вызвалілі нас недзе на пачатку жніўня. Мы вярнуліся ў сваё спаленае Талынава — у зямлянку, у голад. Брат і сястра пайшлі ў ягады, не ведаючы таго, што лес замініраваны, і назад не вярнуліся...

Вось так з нашай вялікай сям'і ў 6 чалавек, засталіся толькі мама і я.

Таму яшчэ адно пытанне, якое хацелася б закрануць у гэтым лісце, — гэта няроўнае рознае жыццё дзяцей. Тых, чые таты (а то і абое бацькоў) загінулі, і тых, чые таты вярнуліся. (Гонар і хвала ім!) Яны, гэтыя дзеці, жылі куды лягчэй, карысталіся льготамі: яны атрымлівалі кватэры і пуцёўкі, машыны і іншае.

Дык ці не час ужо звярнуць увагу і на сапраўдных дзяцей вайны, дзяцей з «вогненных вёсак»?

**Валянціна Фёдараўна АЛЯКСЕЙЧЫК (ШМАТКОВА).**

■ Віншавальная паштоўка

Крычалі госці тост:
— Табе, Ашот,
Жадаем жыць
Не меней, чым сто год!
Ды юбіляра гэта... засмуціла:
Яму за сто даўно пераваліла!
...Мы вып'ем,
Каб праз многа год
Перажылі вы тое ж, што й
Ашот!

Цудоўную майстрыху па дрэве, вядомую агародніцу і гумарыстку **Соф'ю Парфір'еўну КУСЯНКОВУ** з в. Лучын Рагачоўскага раёна шчыра віншуем з прыгожай датай! Здароўя і дабрабыту вам, поспехаў і натхнення!

**Сябры з Мінска.**

■ Рэзананс

## ХОЦЬ У СУБОТУ ДАЙЦЕ ВЫСПАЦЦА!..

**Не ведаю, як іншым, а вось мне захацелася адгукнуцца на допіс спадара Генадзя Аўласенкі «Субота без заняткаў — палёгка ці дадатковыя клопаты» («Звязда», 9 лістапада). Магчыма, таму, што гэтая праблема мне вельмі блізкая: як-ніяк дачка — настаўніца, а ўнукі — вучні.**

На мой погляд, у школе патрэбны два выхадныя на тыдзень. Чаму? Па-першае (і як правіла), яны ёсць у бацькоў, і калі дзеці ў суботу занятыя, то гэтым ствараюцца пэўныя нязручнасці. Яшчэ большая праблема, калі і жонка настаўніца. Што тады рабіць мужу? Па-другое, калі нехта з дзяцей нечым захапляецца, то ён сам прыбяжыць у суботу на секцыю ці ў гурток мастацкай самадзейнасці. Заняткі па прымусе дабра не прыносяць. Па-трэцяе, дзеці, якія хочуць паступіць «на бюджэт», вельмі перагружаны. Гэта тым, хто можа дазволіць сабе вучыцца за грошы, можна, як кажа мая ўнучка-гімназістка, не «парыцца». А ёй жа яшчэ і да рэпетытараў хадзіць... Дык дайце магчымасць хоць у суботу выспацца...

Колькі слоў хацелася б сказаць пра гімназіі. Па маім разуменні, яны — вышэйшая ступень агульнаадукацыйнай школы, мэта якой — падрыхтоўка будучых студэнтаў. Раней гімназістаў-медалістаў прымалі ва ўніверсітэты без уступных экзаменаў. Быў давер да ўзроўню падрыхтоўкі, да справядлівасці ацэнкі ведаў. І гэта правільна. Мае сын і дачка, медалісты сярэдняй школы (не гімназіі), здавалі, напрыклад, толькі па адным экзамене і ВНУ закончылі з «чырвонымі» дыпломамі. Мы з мужам уступныя экзамены не здавалі зусім: нас прынялі па выніках гутаркі. А цяпер...

Мне вельмі шкада дзяцей: яны стараюцца вучыцца, атрымліваюць медалі, аднак на іх далейшы лёс гэта ніяк не ўплывае.

**Валянціна ПАБЯГАЙЛА, г. Ляхавічы.**



Фота слова. Якуба Лясецкага

*Мне столькі вёсен падарыў мой век,*
*Але ў снах ўсё-ткі наплывае:*
*Ляціць апошні ліст і першы снег*
*Услед за ім над сцежкаю кружляе.*
*Быць першым снегам — гэта як прысуд.*
*Бязлітасны прысуд і... зразумелы.*
*Павінен хтосьці першым легчы ў бруд,*
*Каб чорны дол зрабіць анёльска-белым.*
*Усцешыць першы снег, як белы бінт,*
*Гарачыя далоні арабіны —*
*І гэта восень адплыве ў нябыт,*
*Каб зарунелі новыя часіны.*

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY
ДЛЯ ЗВАРОТАЎ
ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY
ДЛЯ ЗВАРОТАЎ
ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY
ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ

# АБ ЧЫМ МАЎЧАЦЬ СОЖ І ПРОНЯ

70 гадоў таму на Магілёўшчыне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў вызвалены маленькі горад Прапойск, які атрымаў назву Слаўгарад

**Іх, жывых сведак гэтай Перамогі, на жаль, з кожным годам усё менш. Ветэранаў на ўвесь раён засталося ўсяго 23. А непасрэдных вызваліцеляў ужо ніводнага. Здавалася, яшчэ не так даўно размаўляла па тэлефоне з адным з іх. Абяцала прыехаць, каб сустрэцца. Не атрымалася. Сёння час ёсць, а чалавека ўжо няма. Балюча. Але ж нездарма кажуць, што памяць даўжэй за чалавечае жыццё. Сённяшні Слаўгарад зусім іншы, але давайце вернемся на 70 гадоў назад, калі тут, на высокім беразе, дзе зліваюцца рэкі Сож і Проня, зямля стагнала ад шматлікіх выбухаў.**



Гісторыя вызвалення Слаўгарада ў граніце.

### «Вада ў Сожы была чырвонай ад крыві»

Ніне Самусевай са слаўгарадскай вёскі Урэчча больш за 80 гадоў. Калі пачалася вайна, яна была зусім яшчэ дзіцем. Кажуць, час лечыць. Але ўспаміны даюцца ёй цяжка: перашкаджаюць слёзы. Памяць пажылой жанчыны захавала кожнае імгненне і не жадае нічога выкрэсліваць.



Ніна Віктараўна САМУСЕВА ўпэўнена, што яе ад смерці выратаваў толькі цуд.

— Наша хатка стаяла там, дзе зараз разросся бэз, — паказвае яна рукой кудысьці ўбок. — Калі прыйшлі немцы, яны выгналі нас з маці і сястрычкамі на вуліцу, у зямлянку. Тых параненых, якія засталіся ў вёсцы пасля адступлення, сцягнулі на гару каля лесу і пакінулі паміраць. На гэтых знявечанных людзей з адарванымі рукамі і нагамі было страшна глядзець. Я і зараз здаецца чую, як яны стогнуць і просяць піць. Але немцы нікому не дазвалялі да іх набліжацца, акрамя нас, дзяцей. І мы, малыя, цягнулі ім ваду ў маленькіх вядзерцах. А немцы рагаталі...

Калі пачалося вызваленне, разам з маці і маленькімі сястрычкамі Ніна начавала ў стагах, ела бульбяное лупінне і мякіну. А калі вярнуліся назад, дом было не пазнаць: выбітыя вокны, разварочаныя столь і падлога. Але ў іншых і гэтага не засталося.

— А ў Прапойску амаль усё згарэла, засталіся царква і некалькі мураваных будынкаў, —- кажа Ніна Віктараўна. — Людзей загінула столькі, што страшна ўспомніць. Немцы акапаліся на гары, а чырвонаармейцы наступалі па лузе, дзе іх было відаць як на далоні. Нават калі хтосьці і дабягаў да Сожа, ужо не меў магчымасці яго пераплысці. Ад такой колькасці забітых вада ў рацэ была чырвонай ад крыві.

### Шашу прымушалі... баранаваць

— Тыя, хто знаходзіўся падчас вызвалення ў Прапойску, успаміналі: немцы баяліся мін і прымушалі жыхароў баранаваць дарогу Масква—Варшава, — кажа намеснік камандзіра пошукавага атрада «Спадчына» Аляксандр Халееў.— Аднойчы яны сабралі падлеткаў і загадалі ім па начах кантраляваць кожны кіламетр трасы. Хлопцы павінны былі паведамляць аб усялякіх дыверсіях. Тым, хто не выканае заданне, пагражалі расстрэлам. Але партызаны паспявалі падкінуць «падарунак» якраз у той момант, калі сыходзіў конь з бараной і пачынала рухацца нямецкая калона.



Пётр СТАРАВОЙТАЎ у гады вайны быў сувязным у партызанаў.

— Калі пачалася вайна, мне было 16 гадоў, — дзеліцца ўспамінамі слаўгарадскі ветэран Пётр Старавойтаў. — Майго старэйшага брата забралі на фронт, а мне сказалі, што яшчэ малы. 1 ліпеня, калі пачалася эвакуацыя, мы падаліся ў бежанцы ў вёску Кашалёў. Бацька застаўся ў горадзе, і я насіў яму прадукты. Першых немцаў пабачыў прыкладна 10 ліпеня 1941 года. Мы з пляменнікам шлі з Кабінай Гары, а насустрач — 3 нямецкія танкеткі. Яны спыніліся. Адзін немец падышоў да мяне і запытаўся: «Салдат?» Я адказаў: «Не». Ён убачыў, што мы нясём з сабой яблыкі і сала. Паспрабаваў яблык і скрывіўся: кіслы. А сала забраў. Немцы паехалі далей, а мы пабеглі ў Кашалёў.

Каб ад мяне была нейкая карысць, збіраў зброю і хаваў у лесе. У 1942 годзе пазнаёміўся з партызанамі, якія знаходзіліся ў Старынках і Целяшах, і перадаў ім свае знаходкі. Так я стаў сувязным, перадаваў ім звесткі, зброю. Аднойчы, калі размаўляў з прыяцелем пра зброю, гэта падслухала суседка і данесла. Немцы забралі нас 15 жніўня 1943 года. Трымалі спачатку ў мясцовай турме, а потым завезлі ў Чэрыкаў. Там з нас здзекаваліся, павыбівалі зубы. Некалькі разоў, калі я страчваў прытомнасць, мяне адлівалі вадой. Патрабавалі зброю, паказвалі данос на мяне, але я ўсё адмаўляў. Скончылася тым, што мяне адправілі ў Германію, у канцлагер, дзе на 2 гады я страціў сваё імя і стаў зваццa № 7520. Калі нас вызвалілі з палону, я важыў усяго 20 кілаграмаў.

### Сын палка

Ураджэнец Прапойска Уладзімір Лісоўскі, якому ў 1943-м ішоў адзінаццаты год, вярнуўся з маці з эвакуацыі адразу пасля вызвалення горада. Успамінае, што разам з хлопцамі, сваімі равеснікамі, бегаў па палявых шпіталях, якіх было вельмі шмат, дапамагаў параненым пісаць лісты дахаты. Хлопчык прыйшоўся даспадобы аднаму афіцэру — гвардыі палкоўніку Пятру Арэф'евічу Юзіфовічу, камандзіру 1210-га стралковага палка 362-й чырванасцяжнай стралковай дывізіі. Ён пачаў прасіць маці, каб адпусціла сына з ім — абяцаў, што зробіць з яго афіцэра. Але маці адмовіла. Тады малы ўпотай залез у «палутарку» і схаваўся пад брызентам. Машыну па дарозе на Быхаў абстраляла нямецкая авіяцыя. Хлопцу пашанцавала застацца ў жывых. Камандзір той вельмі здзівіўся, калі ўбачыў Валодзю. Як сапраўднаму салдату, яму выдалі абмундзіраванне, пісталет і нават каня.

Але 27 ліпеня 1944 года камандзір загінуў. Асірацелага «сына палка» перавялі памочнікам наводчыка баявога мінамётнага разліку. А калі дывізія перадыслацыравалася ў Бабруйск, новы камандзір Пётр Клімачоў адправіў падлетка дадому. Маці, калі ўбачыла сына, не ведала, плакаць ці радавацца: яна ўжо і не спадзявалася ўбачыць яго жывым. Хлопец пайшоў у школу, потым скончыў вышэйшае ваенна-марское вучылішча ў Ленінградзе, стаў кадравым афіцэрам.

### Праз вушка іголкі

— Узялі Прапойск хутка, але вельмі доўгім быў перыяд падрыхтоўкі, амаль 2 месяца,— распавядае пошукавік Аляксандр Халееў. Ён жа заснавальнік віртуальнага музея, прысвечанага гісторыі Слаўгарада. — Немцы давалі чырвонаармейцам магчымасць пераправіцца, акапацца, а потым знішчалі. Але савецкія людзі здзяйснялі сапраўдныя цуды гераізму. Змагаліся ў прамым сэнсе слова за кожную пядзю зямлі. За вызваленне Прапойска артылерыст Пётр Панамароў, які загінуў на месцы бою, і камандзір кулямётнага разліку Вячаслаў Чамадураў атрымалі званні Героя Савецкага Саюза. Але прыкладаў, калі байцы трымаліся да апошняга, было нашмат больш.

Вызвалялі тэрыторыю 3-я армія пад камандаваннем генерала Аляксандра Гарбатава і 50-я, якой камандаваў генерал Іван Болдзін. Частка населеных пунктаў ужо была адбіта ў немцаў, але Гайшын, Рудня, Рабавічы, Улукі, Чырвоная Слабада і сам Прапойск усё яшчэ заставаліся ў руках ворага. Па ім праходзіла нямецкая лінія абароны. На 60 кіламетраў цягнуліся акопы, агароджы з калючага дроту, на кожным кроку былі мінамёты, мінныя палі, кулямётныя кропкі і дзоты. Камандуючы нямецкімі часцямі паабяцаў Гітлеру, што зімаваць будзе ў Прапойску. Усходні вал, здавалася, быў непрыступны.

Каб праваць нямецкія ўмацаванні, генерал Гарбатаў перакінуў дывізію ў раён вёскі Чырвоная Слабада, дзе быў брод. Пачаўся бой. У першых шарэнгах ішло мясцовае насельніцтва — партызаны і так званыя штрафнікі, якіх у 1941-м не забралі на фронт. Больш за 900 з іх загінулі. Гэта была цана за ўзяты плацдарм. Але рушыць далей армія так і не змагла.

І тады Гарбатаў прымае рашэнне вярнуцца назад, у Кармянскі раён, узяць маленькі плацдарм каля вёскі Касцюкоўка і адтуль пачаць наступленне на Прапойск. У гісторыі гэтая аперацыя атрымала назву «Вушка іголкі». На ўчастку 600 на 1300 метраў — чым не вушка іголкі? — наступалі 4(!) дывізіі. Для немцаў гэта было поўнай нечаканасцю. Ніхто не думаў, што па такім маленькім кавалачку зямлі пачне наступаць — без падтрымкі танкаў і авіяцыі! — цэлая армія. Наступленне прайшло паспяхова, і 25 лістапада 1943 года дывізія Васіля Далмажава з паўднёвага боку ўвайшла ў Прапойск. З поўначы ёй насустрач ужо рухалася 110-я дывізія палкоўніка Сяргея Арцем'ева.

### Цана вызвалення

— За час вайны на тэрыторыі раёна была знішчана 51 вёска са 160, колькасць насельніцтва зменшылася з 39 тысячы да 25 тысяч чалавек, — распавядае намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Святлана Язерская. — З 18 тысяч мужчын у жывых засталося толькі 8 тысяч, з вайны не вярнуліся каля 4 тысяч салдат і партызан. Зараз на Слаўгарадчыне знаходзіцца 120 воінскіх пахаванняў, дзе апошні свой прытулак знайшлі амаль 10 000 воінаў. Больш за ўсё іх загінула менавіта ў 1943 годзе.

Падчас святочных мерапрыемстваў, прысвечаных вызваленню раёна, у скверы Вайсковай славы адкрыўся памятны знак — дывізіённая пушка Д-44. Менавіта майстэрства артылерыстаў дазволіла як мага хутчэй разбіць у 1943-м варожыя пазіцыі. Яшчэ адзін памятны знак — гранітная пліта з пералікам усіх дывізій, што прымалі ўдзел у вызваленні раёна, — усталяваны насупраць цэнтральнай плошчы горада, у гарадскім скверы.

### Ад Прапойска да Слаўгарада

Лічыцца, што сваю назву Слаўгарад атрымаў за масавы гераізм, які быў праяўлены пры вызваленні горада. Але афіцыйных звестак наконт гэтага няма. Ва ўспамінах генерала Аляксандра Гарбатава ёсць фраза, што, калі яго часці наблізіліся да Прапойску, камандзір адной з іх — Васіль Далматаў — звярнуўся з прапановай, каб ім не прысвойвалі званне «прапойскай дывізіі». Магчыма, думалі многія, гэта дайшло да Сталіна, і ён загадаў пераназваць Прапойск. Але мясцовыя краязнаўцы больш прытрымліваюцца версіі, што горад атрымаў такую назву «па просьбе працаўнікоў». Маўляў, жыхары звярнуліся да кіраўніцтва рэспублікі і папрасілі аб гэтым. Іх прапанова была задаволена.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**



# 838 вогненных дзён і начэй

26 лістапада для гамяльчан заўсёды дзень асаблівы. Восенню 1943 года горад быў адваяваны і, нарэшце, скінуў аковы акупацыі

**За гады вайны на тэрыторыі горада загінула звыш 28 тысяч мірных жыхароў. У памяць пра воінаў Чырвонай Арміі, партызан і ўсіх загінулых за перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне ў 1967 годзе быў адкрыты мемарыял «Курган Славы». Сёлета за кошт фінансавай падтрымкі арганізацый і прадпрыемстваў Гомеля, а таксама грошай, зробленых на суботніках, памятнаму месцу нададзена новае аблічча. Пасля рэканструкцыі мемарыяла на кургане ўсталяваны жалезабетонны падмурак, зманціраваны гранітныя пліты, зорка і Вечны агонь.**



Ва ўрачыстым мітынгу прынялі ўдзел ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікі органаў улады, студэнцкая моладзь і школьнікі, якія ўсклалі да мемарыяла вянкі і кветкі.

— Сюды, на курган, людзі прыходзяць з усяго горада — каб ушанаваць памяць пра вызваліцеляў горада і загінулых. Мы крыху аднавілі курган, але засталося самае галоўнае — яго сутнасць, — сказаў кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Алег Вялічка.

Зараз каля падножжа кургана замуравана зямля з 200 месцаў баявой славы Беларусі, Расіі і Украіны. Дарэчы, увесь Гомель, нягледзячы на непагадзь, удзельнічае ў разнастайных святочных мерапрыемствах, прысвечаных 70-годдзю вызвалення. Святочнае шэсце сёлета ўпершыню праведзена ў фармаце «Парад пакаленняў»: у адной калоне прайшлі ветэраны і прадстаўнікі моладзі, якія звязалі сваё жыццё з ваеннай справай. Каля брацкай магілы савецкіх воінаў і падпольшчыкаў адбыліся ўрачысты мітынг і ўскладанне кветак, а падчас акцыі «Мы памятаем» маладыя людзі прадставілі партрэты герояў-вызваліцеляў: і тых, хто яшчэ побач з намі, і тых, хто ўжо пайшоў з жыцця. На плошчы Перамогі адбылася моладзевая акцыя «838 вогненных дзён і начэй» — 838 свечак былі запалены ў памяць пра час акупацыі, на працягу якога ў неймаверна цяжкіх умовах змагаліся і працавалі людзі на гэтай зямлі...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

■ Тэатральнае паляванне



# БУДАЎНІК ТЭАТРА ДЛЯ ЎСЁЙ СЯМ'І

**Адзіны раз у жыцці я бачыла, як падчас пахавання на Паўночных могілках чалавек трыццаць акцёраў сярэдняга ўзросту спявалі над свежай магілай свайго настаўніка і рэжысёра яго любімую песню. Песню зусім не журботную. Спявалі і плакалі.**

Яго няма ўжо дзесяць гадоў. Андрэй Андросік пражыў кароткае жыццё, поўнае супярэчнасцяў. Не меў узнагарод і званняў. Таму не трапляе ў спісы тых, каго часта афіцыйна ўспамінаюць.

Але ён пачынаў рабіць вельмі важную справу для годнага мастацкага выхавання дзяцей.

Ён быў вельмі глыбокім, пісьменным і прафесійным педагогам, рэжысёрам, арганізатарам. Атрымаў дзве адукацыі (акцёрскую і рэжысёрскую) у Мінску і Ленінградзе. Дваццаць пяць гадоў быў правай рукой галоўнага рэжысёра тэатра ім. Янкі Купалы Валерыя Раеўскага. Дапамагаў яму, як кажуць у тэатры, «размінаць» акцёраў. Нешта накшталт трэнера. Рабіў велізарную папярэднюю работу для спектакля. І заставаўся ў цэню. Ставіў і сам спектаклі. Крыху цікаватыя, часам мудрагелістыя, але заўсёды паводле добрай класічнай літаратуры.

Яго сябрамі была ўся інтэлігенцыя Мінска, асабліва тэхнары і фізікі, якіх ён далучаў і далучыў да тэатра. Умеў сябраваць па-мужчынску, неўзаемна. Удзельнічаў ва ўсіх культурных акцыях. Пры вельмі сціплай знешнасці быў жанаты з самай прыгожай маладой актрысай купалаўскага тэатра. Быў прамы, бескампрамісны, з-за чаго часта трапляў у разрад нядобранадзейных.

Андросік пяшчотна і ўсёдаравальна любіў сваю дачку Насцю ад першага шлюбу, потым яе сына Алёшу. З хлапчуком амаль не расставаўся, цягаў яго ўсюды за сабой. І стала зразумела, што рэжысёру Андрэю Фёдаравічу Андросіку трэба працаваць у Тэатры юнага гледача: вельмі ўжо добра ведае дзіцячую псіхалогію.

Пасаду мастацкага кіраўніка ТЮГа ён атрымаў, калі яму было ўжо 55 гадоў. За кароткі тэрмін здолеў зрабіць вельмі шмат. Галоўнае — стаў ажыццяўляць тую рэформу, якая пры цяперашняй беднай эстэтычнай школьнай пайцы магла ўцягнуць у дзіцячы тэатр усю сям'ю, а не толькі настаўнікаў з класам на культпаходы.

Сам ён ставіў спектаклі па тэкстах, дзе абавязкова гаварылася пра ўзаемаадносіны дарослых і дзяцей з абавязковым шчаслівым канцом. Іх было ўсяго чатыры: «Кошчын дом», «Палачанка», «Паліяна», «Маленькі лорд Фаўнтлерой» (з 1998 года гэты спектакль ішоў да нядаўняга часу). У іх акцёры не паказвалі дзяцей, а ігралі разам з мінскімі школьнікамі. Сам не паспеў, затое запрашаў на пастаноўкі добрых рэжысёраў, якія ведалі дзіцячую псіхалогію. У ТЮГ стала прыходзіць тая публіка, якая перш нічога не чула пра тэатр. Ён стаў ператварацца ў цэнтр мастацкага выхавання.

**Андрэй Андросік быў вельмі глыбокім, пісьменным і прафесійным педагогам, рэжысёрам, арганізатарам. Пасаду мастацкага кіраўніка ТЮГа ён атрымаў у 55 гадоў. Здолеў зрабіць вельмі шмат. У ТЮГ стала прыходзіць тая публіка, якая перш нічога не чула пра тэатр.**

Перад пачаткам спектакляў у фае тэатра пачыналася свята. Гульні, віктарыны, конкурсы для дзяцей, якія танцавалі і спявалі. Абавязкова няхітрыя ўзнагароды. Шмат музыкі, паветраных шароў і салодкіх пачастункаў. Педагогі і артысты тэатра ненадакучліва рыхтавалі маленькіх гледачоў і іх бацькоў да таго, што яны ўбачаць на сцэне.

Андросік наладзіў трывалыя кантакты са школамі. Усё было не для галачкі, а па загадзе душы. Ён шукаў у школах таленавітых дзяцей з тэатральнымі здольнасцямі і рабіў іх сябрамі тэатра. Адначасна ён і акцёры вывучалі густы, прыхільнасці, гарэзныя выхадкі маленькіх гледачоў, праводзілі ненавязлівую прафілактычную працу.

За доўгія гады існавання Рэспубліканскага тэатра юнага гледача з'явіліся вячэрнія спектаклі, на якія пачала прыходзіць сур'ёзная сталічная публіка і калегі з іншых тэатраў. Падчас рэпетыцый Андросік нервова хадзіў па глядзельнай зале, прысаджваючыся то ў цэнтры, то ў канцы, і бубніў сам сабе: «Тут зала ўсміхаецца. Тут засмяецца. Тут ніхто нічога не пачуе. Тут пападаюць на падлогу нумаркі з гардэроба». Самае цікавае, што пазней, калі спектакль быў гатовы, усё менавіта так і адбывалася.

Андросік адсочваў і далейшую рэакцыю на ўбачаны спектакль у сям'і і школе. Сотні старонак, спісаных дзіцячым почыркам, назапашваліся ў педагагічнай частцы тэатра.

Ён сышоў з жыцця раптам, у росквіце творчых планаў. Асірацеў тэатр. Засталіся вучні, з якімі працаваў у БДТМІ. Дагэтуль ідзе ў Маладзечне яго «Камедыя», якую ён ставіў двойчы. На магілу і прыйсці няма каму, акрамя верных сяброў і вучняў. Сярод найбольш знакамітых — купалавец, народны артыст Беларусі Віктар Манаеў, які, паводле яго прызнання, вучыўся ў Андросіка не толькі прафесіі, але і майстэрству жыць. Студэнты звалі Андросіка «татам».

Наступныя кіраўнікі ТЮГа спрабавалі пераняць і падтрымаць эстафету «тэатра для ўсёй сям'і». Не атрымалася. Засталася памяць.

Многія творчыя лідары на пытанне «Ці ёсць у вас вучні?» ганарліва адказваюць: «У мяне няма вучняў». Не думаецца, што гэта вельмі дрэнна. Дрэнна, таму што нітачка абрываецца на адной яркай асобе. Час задумацца над лёсам усіх настаўнікаў у адукацыі, мастацтве, жыцці. Складаная гэтая і не вельмі ўдзячная справа — вучыць. Сотні добрых настаўнікаў застаюцца без узнагарод, пахвал і захоўвання. Але калі яны працавалі сумленна, аддаючы сябе і згараючы ў тых, каго хацелі навучыць, памяць па іх бясцэнная. Яна не праходзіць, не патрабуе штучных напамінаў. Вучні проста працягваюць сваім прыкладам жыццё настаўніка.

Старая формула: «Настаўнік, выхавай вучня, вырасці асобу. І тады сам будзеш вечны...»

**Таццяна АРЛОВА**

■ Проста цуд

# ЧАГО БОЛЬШ НІДЗЕ НЯМА?



Завяршыўся беларускі XXVI Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC), які праходзіў адначасова ў Мінску, Віцебску і Маладзечне

**Віцебск, па традыцыі, «галоўны горад» фестывалю, бо менавіта тут яго радзіма. Паводле слоў членаў міжнароднага журы фестывальнага конкурсу, фэст з'яўляецца ўнікальнай падзеяй. А міністр культуры Беларусі канстатаваў, што фестываль становіцца... энцыклапедыяй.**



— Шчыра прызнаюся, што было вельмі складана вызначыць тых, хто стане лаўрэатамі конкурсу, — прызнаўся **Раду ПАКЛІТАРУ, старшыня журы, лаўрэат міжнародных конкурсаў, харэограф, мастацкі кіраўнік тэатра сучаснай харэаграфіі «Кіеў мадэрн-балет» (Украіна).**

— Калі б стварылі беларускую зборную каманду па сучасным танцы, яна, безумоўна, была б адной з наймацнейшых — і ў гэтым вялікая заслуга фестывалю, — сказаў **Аляксандр ПЕПЛЯЕЎ, расійскі харэограф, рэжысёр, лаўрэат міжнародных конкурсаў, мастацкі кіраўнік аб'яднання тэатраў танца Расіі «Цэх».**

Цікава, што фэст у наступным годзе можа рэфармавацца, бо члены журы прыйшлі да высновы: неабходна конкурсныя працы падзяліць на камерныя (аўтарскія) і «традыцыйныя». Каб складаныя з пункту гледжання гледача конкурсныя пастаноўкі можна было б паказваць асобна. А ў Міністэрстве культуры Беларусі і ў будучыні гатовы падтрымліваць віцебскі фестываль — адну з самых яскравых падзей у культурным жыцці.

— У нашай краіне гарадам прысвойваецца афіцыйнае званне «Культурная сталіца Беларусі». Сёлета яго носіць Магілёў, а ў наступным годзе гэты тытул будзе перададзены Гродна. Але ж «некаранаваная культурная сталіца», безумоўна, Віцебск. У тым ліку і дзякуючы фестывалю сучаснай харэаграфіі,— сказаў **Барыс СВЯТЛОЎ, міністр культуры Рэспублікі Беларусь.**

Паводле слоў міністра, фестывальныя падзеі становяцца своеасаблівай энцыклапедыяй такога запатрабаванага кірунку мастацтва, як сучасная харэаграфія. Ён таксама адзначыў, што міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі можна лічыць узорным прыкладам паспяховага партнёрства дзяржавы і бізнесу ў галіне культуры. З рук міністра адпаведныя дыпломы атрымалі прадстаўнікі генеральнага партнёра фэсту — прадпрыемства «Белвест», а таксама кампаніі «МТС» і Белінвестбанк.

На фестывалі была прэзентавана кніга «Сучасны танец на постсавецкай прасторы», якая адлюстроўвае гістарычныя этапы зараджэння, развіцця і росквіту гэтага ўнікальнага фэсту.

— Нязменны кіраўнік фестывалю і аўтар ідэі яго правядзення Марына Раманоўская і яе каманда ўкладваюць у арганізацыю ўсю душу. Таму і ўзровень правядзення фэсту вельмі высокі, — адзначае **Аляксандр СІДАРЭНКА, генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск».**

Высока ацэньвае гэтае свята танца і **Леў ШУЛЬМАН, спецыяліст у галіне сучаснага танца, рэжысёр, прадзюсар з Санкт-Пецярбурга.**

Цікава, што толькі ў другой палове 1990 гадоў аналагічныя фестывалі з'явіліся ў Санкт-Пецярбургу, а потым — у Маскве. Адна з расійскіх газет федэральнага ўзроўню ў свой час адзначыла: «У сучаснай харэаграфіі Масква ідзе адразу за Віцебскам».

За прэміі конкурсу сёлета змагаліся калектывы з усіх абласцей краіны.

У ***намінацыі «Харэаграфічная мініяцюра»*** вызначаны лаўрэаты, і яны абодва з Мінска: «Праект Сяргея Мікеля «BGAM Company» (пры садзейнічанні Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа) і «Група сучаснай харэаграфіі «Розныя твары».

Уладальнікамі ***спецыяльнай прэміі конкурсу сталі:*** «Skvo's Dance Company» (Мінск) і «Творчая майстэрня сучасных формаў мастацтваў «Обои» (Гомель) — адпаведна, у намінацыях «За выканаўчае майстэрства» і «Перспектыва».

Уладальнікам спецыяльнай прэміі «Творчы аванс» ад арганізатара фэсту «Цэнтра культуры «Віцебск» стаў «Праект Кірыла Балтрукова «синОNиМЫ» (Мінск).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Віктара НІКАЛАЕВА**

# Не толькі дэфіле

## БЕЛАРУСКА АТРЫМАЛА КАРОНУ НА КОНКУРСЕ «МІСІС ЕЎРОПА-2013»

**Праўда, гэта не карона пераможцы, а тытул адной з віцэ-місіс. Але прадстаўніца Беларусі, адвакат Наталля Трафімава, упэўнена, што ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі трапіць у прызёры конкурсу найпрыгажэйшых жанчын Еўропы — таксама вельмі добры вынік.**

Нагадаем, сёлета конкурс «Місіс Еўропа», які мае ўжо больш чым 10-гадовую гісторыю, праходзіў з 17 па 21 лістапада ў Адэсе. У ім узялі ўдзел 18 жанчын з 15 краін Еўропы ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў, якія адбыліся як жонкі і маці, а таксама дасягнулі пэўных поспехаў у прафесіі. Перамога і галоўная карона дасталіся прадстаўніцы Расіі, дырэктару мадэльнай школы Марыі Ярашэнкі, беларуска заняла трэцяе месца. Усе астатнія канкурсанткі былі адзначаны журы ў спецыяльных намінацыях паводле праяўленых здольнасцяў, рыс характару ці фізічных даных. Напрыклад, прадстаўніца Польшчы, між іншым, патолагаанатам па прафесіі, стала «Місіс Інтэлігентнасць», а ўдзельніца з Чарнагорыі, маці траіх дзяцей, была прызнана «Місіс Дасканаласць» і «Місіс Мацярынства».

«Уражанні хоць крыху і ўлегліся, але ўсё адно засталіся вельмі прыемныя, — падзялілася Наталля ў інтэрв'ю «Звяздзе». — Па-першае, сабраліся вельмі прыгожыя і ўпэўненыя ў сабе, паспяховыя жанчыны: многія маюць уласны бізнес, усе ў той ці іншай ступені займаюцца дабрачыннасцю. Па-другое, у нас была вельмі цікавая праграма — для мяне вельмі важна, што конкурс меў на ўвазе не толькі дэфіле ў купальніках і вячэрніх уборах, але і меў сацыяльны складнік. Напрыклад, на форуме мы абменьваліся практычным вопытам па барацьбе з гвалтам у сям'і, наведвалі з дабрачыннай місіяй дзіцячы дом, дзе пакінулі выхаванцам падарункі. Сувеніры, якія я падрыхтавала, былі звязаны найперш са спартыўным першынством, якое чакае Беларусь у наступным годзе — чэмпіянатам свету па хакеі-2014.

Даведка «Звязды»

***Наталля Трафімава — практыкуючы адвакат з больш чым 15-гадовым вопытам працы, заснавальніца юрыдычнай кампаніі. Удзельніца конкурсаў «Місіс Сусвет-2012», «Лэдзі Бос-2012». Выхоўвае 12-гадовага сына.***





Дарэчы, адмысловы сувенір Наталля прэзентавала і мэру Адэсы — стылізаваную саламяную лялльку ручной работы з запрашэннем на ЧС па хакеі.

Цяпер на працягу года ўсе прызёры конкурсу «Місіс Еўропа 2013» будуць не толькі з гонарам дэманстраваць атрыманыя кароны, але і выконваць сацыяльную місію — ладзіць дабрачынныя акцыі ў прытулках і дзіцячых дамах, выязныя семінары па павышэнні прававой адукаванасці насельніцтва, праекты па барацьбе з гвалтам у сям'і. Праз год прыгажуні павінны зрабіць справаздачу аб выніках сваёй працы. «Мне, у прыватнасці, паступіла цікавая прапанова паўдзельнічаць у праграме Фонду ААН па абароне правоў чалавека», — расказала Наталля Трафімава. Дарэчы, яна не выключае для сябе далейшага ўдзелу ў конкурсах прыгажосці — калі тыя будуць мець сацыяльны складнік і прыцягваць увагу грамадскасці да вострых праблем сучаснасці. Тым больш, прапановы на гэты конт ужо ёсць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з сацыяльных сетак.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1895** год — адзін з найбагацейшых людзей канца XIX стагоддзя Альфрэд Нобель падпісаў апошні варыянт свайго завяшчання. Да гэтага Нобеля падштурхнула памылковая публікацыя яго некралога ў адной з французскіх газет, у якой вучонага асуджалі за вынаходства дынаміту. Тады ён вырашыў пакінуць пасля сябе больш каштоўную спадчыну. Свой велізарны капітал вучоны распарадзіўся накіраваць на штогадовае прысуджэнне пяці прэмій: (па літаратуры, прэмія міру і яшчэ тры «за навуковыя дасягненні, якія прынеслі найбольшую карысць чалавецтву». Як і хацеў Нобель, прэмія стала міжнароднай. Статус Нобелеўскай прэміі вызначаецца не столькі значнай сумай грошай, колькі яе прэстыжнасцю.



**1903** год — 110 гадоў таму нарадзіўся (вёска Сакоўцы, цяпер Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці) Піліп (Піліп Сямёнавіч) Пестрак, беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968), удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Амаль 11 гадоў правёў у польскіх турмах, сядзеў у турмах Пінска, Вільні, Гродна. Вызвалены савецкімі ўладамі пасля паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 года. У Вялікую Айчынную вайну — удзельнік партызанскага руху ў Беларусі. Дэбютаваў у друку ў 1926-м (часопіс «Родныя гоні»). Падчас зняволення (1929—1939) змяшчаў вершы ў нелегальным рукапісным часопісе «Краты», які выдаваўся палітвязнямі. У 1940-м апублікаваў першы зборнік вершаў «На варце». Тэме барацьбы ў Заходняй Беларусі прысвяціў раман «Сустрэнемся на барыкадах». Раман «Серадзібор» прысвечаны жыццю вёскі. Перакладаў на беларускую мову творы польскіх (Э. Ажэшка, У. Бранеўскі, С. Дабравольскі, Е. Путрамант), украінскіх (І. Франко, Л. Украінка, М. Рыльскі, П. Тычына), латышскіх, літоўскіх пісьменнікаў. Выступаў з літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі артыкуламі. Памёр у 1978 годзе.

**1947** год — нарадзіўся Анатоль Кірылавіч Цітоў, беларускі гісторык, геральдыкі, сфрагіст. Аўтар навуковых і публіцыстычных прац па геральдыцы, генеалогіі, гісторыі рамёстваў і гістарычнай геаграфіі. Быў членам камісіі па выпрацоўцы эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і палажэнні аб гербе, узораў пячатак Вярхоўнага Савета, яго Прэзідыума і нагруднага знака народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь.

Было сказана

**Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык, літаратурны крытык:**
*«Пад зімовай беласнежнай маскай*
*Бачу я чароўны твар вясны...».*

# Расійская прэмія — кітайскаму сябру беларускай літаратуры

**Кітайскага перакладчыка Гао Мана, чый творчы шлях на ніве прыгожага пісьменства пачынаўся яшчэ ў канцы 1940-х гадоў, добра ведаюць у Беларусі. Яшчэ ў 1950-ыя гг. ён наведаў Мінск. Тады ж у Пекіне пабачыла свет кніга выбраных вершаў Максіма Танка ў перакладзе на кітайскую мову.**

Нядаўна сябра беларускай літаратуры адзначаны расійскай прэміяй «Расія — Новы век». Адзнака ўручана Гао Ману за пераклад паэмы Ганны Ахматавай «Рэквіем». Яшчэ ў 1996 годзе перакладчык стаў ганаровым членам Саюза пісьменнікаў Расіі. Сярод узнагарод майстра мастацкага перакладу — расійскі ордэн Дружбы. Кітайскі літаратар — перакладчык твораў А. Пушкіна, Т. Шаўчэнкі, многіх іншых пісьменнікаў славянскіх краін.

Гао Ман пераклаў на кітайскую мову і адну з кніг Святланы Алексіевіч. Творца добра вядомы як каліграф, з'ўляецца ганаровым членам Расійскай акадэміі мастацтваў. Дарэчы, у арсенале графічных прац Гао Мана — партрэты Якуба Коласа, Янкі Купалы, Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Святланы Алексіевіч, Максіма Танка, Навума Гальпяровіча.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.58 | 16.55 | 7.57 |
| Віцебск — | 8.54 | 16.38 | 7.44 |
| Магілёў — | 8.48 | 16.45 | 7.57 |
| Гомель — | 8.38 | 16.49 | 8.11 |
| Гродна — | 9.13 | 17.12 | 7.59 |
| Брэст — | 9.06 | 17.20 | 8.14 |

## Месяц

***Апошняя квадра 25 лістапада. Месяц у сузор'і Дзевы.***

## Імяніны

***Пр.*** *Ганны, Аляксандра, Аляксея, Віктара, Пятра, Рыгора, Сяргея.*
***К.*** *Валерыі, Ксеніі, Валяр'яна, Максіма, Юзафа, Яраслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




УСМІХНЕМСЯ

**Кулінарная кніга для мужчын.**
**Вучымся варыць суп з фрыкадэлькамі. Спачатку неабходна ачысціць пельмені ад «лупін»...**

Жонка — мужу:
— Ты надоўга да сяброў?
— Не. Хуценька нап'юся і назад.

**Алкаголь з'яўляецца выдатным растваральнікам. Ён растварае шлюбы, сяброўствы, працоўныя месцы, банкаўскія рахункі, печань і мозг. Але толькі не праблемы.**

— Мяне ніхто не любіць.
— Я люблю цябе.
— Няўжо цяжка памаўчаць і паслухаць?

**Як ні круці, але лепшая шафа для адзення — гэта крэсла.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 5055.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 лістапада 2013 года.